Пролетарыі ўсіх краін, еднайцеся!

Комуністычная партыя (большэвікоў) Беларусі

ЗВЯЗДА

ОРГАН ЦК КП(б) БЕЛАРУСІ, СОЎНАРКОМА І ПРЭЗІДЫУМА ВЯРХОЎНАГА СОВЕТА БССР

49 (7375)
СЕРАДА
14
сакавіка 1945 г.

Цана 20 кап.

ЗАГАД

Вярхоўнага Галоўнакамандуючага

Камандуючаму войскамі 2-га Беларускага фронта
Маршалу Совецкага Саюза РАКАСОЎСКАМУ
Начальніку штаба фронта
Генерал-палкоўніку БАГАЛЮБАВУ

Войскі 2-га БЕЛАРУСКАГА фронта, прадаўжаючы наступленне, авалодалі важнымі апорнымі пунктамі абароны немцаў на подступах да ДАНЦЫГА і ГДЫНІ—гарадамі ТЧЭЎ (ДЗІРШАУ), ВЕЙХАРАВА (НАЙШТАДТ) і выйшлі на ўзбярэжжа Данцыгскай бухты на поўначы ад ГДЫНІ, заняўшы горад ПУЦК (ПУТЦЫГ).

У баях за авалоданне гарадамі ТЧЭЎ, ВЕЙХАРАВА і ПУЦК вызначыліся войскі генерал-лейтэнанта РАМАНОЎСКАГА, генерал-палкоўніка ФЕДЗЮНІНСКАГА, генерал-лейтэнанта ЛЯПІНА, генерал-лейтэнанта КОКАРЗВА, генерал-маёра КАРАТКОВА, генерал-лейтэнанта ПАЛЕНАВА, генерал-лейтэнанта МІКУЛЬСКАГА, генерал-маёра ХУДАЛАВА, палкоўніка АСТАФ'ЕВА, палкоўніка КАРШУНОВА, палкоўніка ПАЛУВЕШКІНА, палкоўніка ГРЭБЕНКІНА, палкоўніка ХРАМЦОВА, палкоўніка КУРЭНЯ, генерал-маёра ЛЯШЧЭНКА, генерал-маёра РАДЫГІНА, генерал-маёра БАРШЧОВА, генерал-маёра ДЗМІТРЫЕВА, генерал-маёра ІГНАЦЬЕВА; танкісты генерал-лейтэнанта танкавых войск ПАНФІЛАВА, генерал-маёра ДРЭМАВА, палкоўніка БАБАДЖАНЯНА, палкоўніка МАЛЮЦІНА, палкоўніка УРВАНАВА, падпалкоўніка ЕГОРАВА, падпалкоўніка КУЦ, падпалкоўніка РАЗАНЦАВА, падпалкоўніка НЕМКОВІЧА, палкоўніка ХАРЫТОНАВА, палкоўніка АНЦІПАВА, падпалкоўніка КАРЖЭЎСКАГА, маёра ЖАБІНА, падпалкоўніка БАЛЫКОВА; артылерысты генерал-маёра артылерыі ВЕЗРУК, генерал-маёра артылерыі КАЗАКОВА, генерал-маёра артылерыі КАЗНОВА, генерал-маёра артылерыі РАГОЗІНА, генерал-маёра артылерыі МАЛАФЕЕВА, палкоўніка АЛФЕРАВА, палкоўніка КАТУНІНА, палкоўніка ГЕРАСІМЕНКА, палкоўніка КІРГЕТАВА, палкоўніка БЕЛЯКОВА, падпалкоўніка ЗЕРНОВА, падпалкоўніка АХТЫРЧАНКА, палкоўніка ГНІДЗІНА, падпалкоўніка МУРЫНАВА, падпалкоўніка АНАНІЧА; лётчыкі генерал-палкоўніка авіяцыі ВЕРШЫНІНА, генерал-маёра авіяцыі АЛЕКСЕЕВА, генерал-маёра авіяцыі БАРЫСЕНКА, генерал-маёра авіяцыі ГЕЦЬМАНА, палкоўніка ОСІПАВА, палкоўніка ЦІХАМІРАВА, палкоўніка СМАЛАВІКА, палкоўніка ВУС, палкоўніка ВОЛКАВА; сапёры палкоўніка НЕМІРОЎСКАГА, палкоўніка КЛЕМЕНЦЬЕВА, падпалкоўніка ПЕТРОВА, інжынер-палкоўніка ПАЛАЎНЁВА, палкоўніка БАБАЕВА; сувязісты маёра ТАРАСАВА, маёра ЛІТОЎЧАНКА, маёра КАЛАДЗЕЕВА.

У азнаменаванне атрыманай перамогі злучэнні і часці, якія найбольш вызначыліся ў баях за авалоданне названымі гарадамі, прадставіць да ўзнагароджання ордэнамі.

Сёння, 12 сакавіка, у 22 гадзіны сталіца нашай Радзімы—МАСКВА ад імені Радзімы салютуе доблесным войскам 2-га Беларускага фронта, авалодаўшым гарадамі ТЧЭЎ, ВЕЙХАРАВА і ПУЦК, — дваццаццю артылерыйскімі залпамі з двухсот дваццаці чатырох гармат.

За выдатныя баявыя дзеянні АБ'ЯЎЛЯЮ ПАДЗЯКУ кіруемым Вамі войскам, якія ўдзельнічалі ў баях за вызваленне пайменаваных гарадоў.

Вечная слава героям, паўшым у баях за свабоду і незалежнасць нашай Радзімы!

Смерць нямецкім захопнікам!

Вярхоўны Галоўнакамандуючы
Маршал Совецкага Саюза І. СТАЛІН.

12 сакавіка 1945 г.
№ 299.

ЗАГАД

Вярхоўнага Галоўнакамандуючага

Камандуючаму войскамі 1-га Беларускага фронта
Маршалу Совецкага Саюза ЖУКАВУ
Начальніку штаба фронта
Генерал-палкоўніку МАЛІНІНУ

Войскі 1-га БЕЛАРУСКАГА фронта пасля ўпорных баёў сёння, 12 сакавіка, штурмам авалодалі горадам і крэпасцю КІСТЖЫНЬ (КЮСТРЫН)—важным вузлом шляхоў зносін і магутным апорным пунктам абароны немцаў на рацэ ОДЭР, які прыкрывае подступы да БЕРЛІНА.

У баях за авалоданне горадам і крэпасцю КІСТЖЫНЬ вызначыліся войскі генерал-лейтэнанта БЕРЗАРЫНА, генерал-маёра ВАРФАЛАМЕЕВА, генерал-маёра КУШЧАВА, генерал-маёра ЖЭРЭБІНА, генерал-маёра ДАРАФЕЕВА, генерал-маёра СЫЗРАНАВА, палкоўніка ЛЮБКО, падпалкоўніка КАЗЛОВА, падпалкоўніка ЧАЙКА, падпалкоўніка КУРКАЦЬІШВІЛІ, палкоўніка ФЕДОТАВА; артылерысты генерал-маёра артылерыі КАСЕНКА, генерал-маёра артылерыі БРУХАНАВА, палкоўніка ФІЛІПОВІЧА, палкоўніка ПЕУНЕВА, палкоўніка ГУЦІНА, палкоўніка МЕНЬШЫКАВА, палкоўніка ЛАБАНАВА, палкоўніка ПАУЛАВА, падпалкоўніка ЗУБАВА, палкоўніка СОКАЛАВА, падпалкоўніка МІШЫНА, падпалкоўніка ЧЭРНЫШКОВА, падпалкоўніка АШЫХМІНА, падпалкоўніка СКВАРЦОВА, падпалкоўніка ЖОХАВА, палкоўніка МІХАЙЛАВА, маёра МАХМУДАВА, падпалкоўніка САЗОНАВА; танкісты падпалкоўніка ЖЫЛА, падпалкоўніка СУЗДАЛАВА; лётчыкі палкоўніка ФЕДАРЭНКА, палкоўніка БЕРКАЛЬ, палкоўніка ТІМАФЕЕВА, палкоўніка КАЛІНІНА, палкоўніка ФЕДАРАВА; сапёры палкоўніка КУЗЬМІНА, маёра БЛОХІНА, маёра НАМЕРОЎСКАГА, маёра БЛІНАВА; сувязісты падпалкоўніка СЦЕПАНАВА.

У азнаменаванне атрыманай перамогі злучэнні і часці, якія найбольш вызначыліся ў баях за авалоданне горадам і крэпасцю КІСТЖЫНЬ (КЮСТРЫН), прадставіць да ўзнагароджання ордэнамі.

Сёння, 12 сакавіка, у 23 гадзіны сталіца нашай Радзімы—МАСКВА ад імені Радзімы салютуе доблесным войскам 1-га Беларускага фронта, авалодаўшым горадам і крэпасцю КІСТЖЫНЬ—дваццаццю артылерыйскімі залпамі з двухсот дваццаці чатырох гармат.

За выдатныя баявыя дзеянні АБ'ЯЎЛЯЮ ПАДЗЯКУ кіруемым Вамі войскам, якія ўдзельнічалі ў баях за авалоданне КІСТЖЫНЬ.

Вечная слава героям, паўшым у баях за свабоду і незалежнасць нашай Радзімы!

Смерць нямецкім захопнікам!

Вярхоўны Галоўнакамандуючы
Маршал Совецкага Саюза І. СТАЛІН.

12 сакавіка 1945 г.
№ 300.

УКАЗ

Прэзідыума Вярхоўнага Совета СССР

АБ УЗНАГАРОДЖАННІ ОРДЭНАМІ ПАРТЫЙНЫХ І СОВЕЦКІХ РАБОТНІКАЎ РАЁНАЎ БЕЛАРУСКАЙ ССР

Улічваючы, што ва ўмовах ваеннага часу работа па хлебанарыхтоўках мае асабліва важнае значэнне для дасягнення перамогі над ворагам і прыроўніваецца па сваёму значэнню да франтавой работы, узнагароджаць за паспяховае выкананне дзяржаўнага плана хлебанарыхтовак 1944 года

ОРДЭНАМ АЙЧЫННАЙ ВАЙНЫ II СТУПЕНІ

1. Дземко Віктара Грыгор'евіча—упаўнаважанага Наркамзага па Асвейскаму раёну.

2. Сініпка Макара Пракоф'евіча—старшыню выканкома Стрэшынскага райсовета дэпутатаў працоўных.

3. Садавога Яўгенія Грыгор'евіча—першага сакратара Стрэшынскага райкома КП(б) Беларусі.

4. Сергушка Антона Іванавіча — першага сакратара Асвейскага райкома КП(б) Беларусі.

5. Сташкевіча Грыгорыя Сямёнавіча — старшыню выканкома Заслаўскага райсовета дэпутатаў працоўных.

6. Сурупіна Залмана Вульфавіча — упаўнаважанага Наркамзага па Стрэшынскаму раёну.

7. Трыгубовіча Францка Браніслававіча—першага сакратара Воранаўскага райкома КП(б) Беларусі.

8. Чэніндзіна Нікіту Харытонавіча — старшыню выканкома Воранаўскага райсовета дэпутатаў працоўных.

Старшыня Прэзідыума Вярхоўнага Совета СССР
М. КАЛІНІН.

Сакратар Прэзідыума Вярхоўнага Совета СССР
А. ГОРКІН.

Масква, Крэмль.
1 лютага 1945 года.

Тэлеграма румынскага ўрада І. В. СТАЛІНУ

БУХАРЭСТ, 10 сакавіка. (ТАСС). Румынскія газеты паведамілі сёння, што совет міністраў накіраваў І. В. Сталіну тэлеграму, ў якой гаворыцца:

«Маршалу СССР Іосіфу Вісарыёнавічу Сталіну. Крэмль.

Румынскі ўрад з першага моманту свайго фарміравання звяртаецца да Вас, Ваша Правасхадзіцельства, і шле Вам сваё палкае прывітанне. Румынскі ўрад, які з'яўляецца ўвасабленнем волі румынскага народа, прыняўшы самаволю вялікай місіі, узятай на сябе Совецкім Саюзам, для знішчэння фашызма, намерэн дзейнічаць такім чынам, каб Румынія неадкладна аказала садзеянне ўсімі сваімі сіламі ў барацьбе за разгром фашызма. Румынскі ўрад цвёрда рашыў пакончыць са змрочным мінулым, дакладна выканаць усе ўзятыя Румыніяй перад саюзнікамі абавязацельствы і падтрымліваць самыя цесныя і дружэскія адносіны з вялікім усходнім суседам. Выконваючы гэтыя пачэсныя абавязацельствы, румынскі ўрад спадзяецца стварыць для Румыніі міжнароднае становішча, якое дазволіць ёй удзельнічаць у справе мірнай арганізацыі будучага міру. Няхай жыве агульная барацьба народаў супроць фашызма! Няхай жыве Чырвоная Армія - вызваліцельніца! Няхай жыве дружба паміж совецкімі і румынскім народамі!

Старшыня Совета Міністраў Петрэ Гроза».

Адначасова румынскім урадам адпраўлены тэлеграмы прэзідэнту Рузвельту і прэм'ер-міністру Чэрчыллю.

Баявая праграма развіцця сельскай гаспадаркі Беларусі!

Сёння мы друкуем пастанову Совета Народных Камісараў БССР і Цэнтральнага Камітэта КП(б) Беларусі аб дзяржаўным плане развіцця сельскай гаспадаркі БССР на 1945 год.

«Совет Народных Камісараў БССР і Цэнтральны Камітэт КП(б)Б,—гаворыцца ў пастанове,—лічаць галоўнай задачай калгасаў, машынна-трактарных станцый, соўгасаў, зямельных органаў, партыйных і совецкіх арганізацый у галіне сельскай гаспадаркі хутчэйшае аднаўленне і далейшае развіццё сельскай гаспадаркі рэспублікі з тым, каб у бліжэйшыя 2—3 гады забяспечыць аднаўленне даваенных размераў пасеўных плошчаў, павышэнне ўраджайнасці і павелічэнне валавога збору збожжа, бульбы і іншых сельскагаспадарчых прадуктаў».

Задачы, якія пастаўлены партыяй і ўрадам перад сельскай гаспадаркай рэспублікі на 1945 год, выключна вялікія і адказныя. Пастанова партыі і ўрада—гэта баявая праграма аднаўлення і далейшага развіцця нашых калгасаў, соўгасаў і МТС. Каб паспяхова ажыццявіць гэтую праграму, ад совецкіх і партыйных арганізацый, зямельных органаў, калгасаў, МТС і соўгасаў патрабуецца сканцэнтраванне намаганняў на паспяховае вырашэнне намечаных мерапрыемстваў.

Прайшло ўсяго 8 месяцаў з таго часу, як доблесная Чырвоная Армія вызваліла Беларусь з фашысцкай няволі. За гэты параўнальна кароткі час прароблена значная работа па аднаўленню разбуранай ворагам сельскай гаспадаркі. Не гледзячы на вялікі недахват рабочых рук, пягла, машын, перамагаючы пяжкаспі ваеннага часу, калгасы, соўгасы, МТС і сяляне-аднаасобнікі арганізавана правялі ўборку ўраджаю ў мінулым годзе, своечасова выканалі абавязацельствы перад дзяржавай і паспяхова правялі сяўбу азімых культур.

Поспехі працаўнікоў палёў тлумачацца перш за ўсё іх небывала вялікай палітычнай і працоўнай актыўнасцю. Радасць вызвалення, гарачае жаданне ўсямерна дапамагчы гераічнай Чырвонай Армії хутчэй дабіць фашысцкага звера ў яго логаве натхняюць калгаснікаў, рабочых і служачых МТС і соўгасаў, сялян-аднаасобнікаў на новыя прапоўныя подвігі.

Наша рэспубліка знаходзіцца напярэдадні веснавой сяўбы. Ад ступені падрыхтаванасці да яе будзе залежаць поспех палявых работ, заваяванне высокага ўраджаю. Вось чаму важна цяпер як мага лепш выкарыстаць дні, якія асталіся да выхаду ў поле, каб падрыхтаваць вясне большэвіцкую сустрэчу.

Рыхтуючы да веснавой сяўбы высокаякаснае насенне, спраўны інвентар, трэба максімальна скарыстаць санны шлях для вывазу на палі ўгнаенняў. Асабліва трэба шырока выкарыстаць на ўгнаенне торф і кампастыраваць яго з гноем, гноевай жыжай, фекаліямі і іншымі ўгнаеннямі. Значэнне торфу ў падняцці ўраджайнасці палёў у Беларусі выключна вялікае. У агульным балансе арганічных угнаенняў калгасных палёў торф і да вайны складаў каля 50 процантаў. Тым большая ўвага гэтаму каштоўнаму ўгнаенню павінна аддавацца цяпер, калі пасля трохгадовага гаспадарання нямецкіх акупантаў зямля стала спустошанай, рэзка скарацілася жывёлагадоўля.

У паспяховым правядзенні палявых работ выключнае значэнне мае добрае жывое пягло калгасаў і соўгасаў. Соўнарком БССР і ПК КП(б)Б абавязалі аблвыканкомы, райвыканкомы, абкомы і райкомы КП(б)Б забяспечыць замацаванне рабочых коней і валоў на ўвесь перыяд палявых работ за паляводчымі брыгадамі, а ўнутры брыгад—за паасобнымі калгаснікамі. Для рабочай жывёлы ў кожным калгасе і соўгасе на перыяд веснавой сяўбы неабходна забраніраваць патрэбную колькасць сена і канцэнтраваных кармоў. За месяц да пачатку палявых работ калгасы вызваляюцца ад працугжпавіннасці для таго, каб даць адпачынь пяглу. Там, дзе нехапае пягла, неабходна выкарыстоўваць на лёгкіх палявых і транспартных работах малапрадуктыўных кароў калгасаў і калгаснікаў.

Поспех веснавой сяўбы, а таксама ўсіх сельскагаспадарчых работ будзе залежаць ад правільнай арганізацыі працы калгаснікаў. Да выхаду ў поле трэба ў кожным калгасе замацаваць участкі за паляводчымі брыгадамі. Неабходна таксама выдзеліць палявыя ўчасткі ў натуры пад пасеў культур, якія замацаваны за звеннямі.

Змагаючыся за атрыманне высокага ўраджаю, у кожным калгасе і соўгасе да пачатку веснавых палявых работ трэба распрацаваць канкрэтныя агратэхнічныя мерапрыемствы па правядзенню веснавой сяўбы і догляду пасеваў. Задача кожнага калгаса і соўгаса — забяспечыць размяшчэнне ўсіх культур у палях севазваротаў, а дзе севазваротаў яшчэ няма—на лепшых для кожнай культуры папярэдніках.

Нашай рэспубліцы за паспяховае выкананне машынна - трактарнымі станцыямі студзеньскага плана рамонту трактараў і сельгасмашын уручан Пераходны Чырвоны Спяг Дзяржаўнага Камітэта Абароны. МТС рэспублікі паспяхова выканалі і гадавы план рамонту трактараў. Каб моцна трымаць Пераходны Чырвоны Спяг Дзяржаўнага Камітэта Абароны, трактарысты, рабочыя і служачыя МТС павінны ўсямерна шырыць усебеларускае сацыялістычнае спаборніцтва за ўзорную падрыхтоўку да сяўбы і выдатнае правядзенне ўсіх сельскагаспадарчых работ. Трэба памятаць, што кожны адноўлены і здрамантаваны трактар звыш плана паскорыць правядзенне веснавой сяўбы. Да выхаду ў поле трэба ўзорна падрыхтаваць машынны парк МТС, прадугледзець кожную дробязь, якая-б не змагла з'явіцца тормазам у рабоце.

Соўнарком БССР і ПК КП(б)Б намецілі цэлы рад мерапрыемстваў па аднаўленню і развіццю сельскай гаспадаркі заходніх абласцей рэспублікі. Партыйныя, совецкія і зямельныя органы гэтых абласцей павінны хутчэй ліквідаваць марудлівасць у вырашэнні важнейшага гаспадарчага і палітычнага пытання ў сельскай гаспадарцы заходніх абласцей — надзяленне зямлёй беззямельных і малазямельных сялян. Для аказання дапамогі бясконным гаспадаркам па хутчэйшаму правядзенню імі веснавой сяўбы і ўсіх сельскагаспадарчых работ, пастановай намечана аднаўленне ва ўсіх раёнах МТС, машынна-конных пракатных пунктаў, арганізацыя ўзаемадапамогі ў апрацоўцы і абсемяненні зямель і г. д.

Выкананне плана аднаўлення і далейшага развіцця сельскай гаспадаркі Беларусі на 1945 год з'яўляецца важнейшай ваенна-гаспадарчай задачай совецкіх і партыйных арганізацый, зямельных органаў, калгасаў, МТС і соўгасаў, камуністаў і комсамольцаў, аграномаў, калгаснікаў і калгаснік, сялян заходніх абласцей, рабочых і служачых.

Па-баявому-ж арганізуем барацьбу за лепшую падрыхтоўку да сяўбы, узорнае правядзенне ўсіх сельскагаспадарчых работ. Дапаможам Чырвонай Армії хутчэй дабіць фашысцкага звера ў яго логаве, забяспечым чырвоных воінаў і насельніцтва прадуктамі харчавання, а прамысловасць—сыравінай.

Ад Совецкага Інформбюро

АПЕРАТЫЎНАЯ ЗВОДКА ЗА 12 САКАВІКА

Войскі 2-га БЕЛАРУСКАГА фронта, прадаўжаючы наступленне, авалодалі важнымі апорнымі пунктамі абароны немцаў на подступах да ДАНЦЫГА і ГДЫНІ—гарадамі Тчэў (Дзіршаў), Вейхарава (Нойштадт) і выйшлі на ўзбярэжжа Данцыгскай бухты на поўначы ад ГДЫНІ, заняўшы горад ПУЦК (ПУТЦЫГ). Адначасова войскі фронта занялі больш 100 другіх населеных пунктаў і сярод іх КВАШЫН, КОПЛЕТЦКАУ, РЭШКЕ, ГНЕВАУ, ГРОС ШЛАТАУ, ЗЕЛІСТРАУ, ПОЛЬЦЫН, ВЕРБЛІН, ШЛАВОШЫК, КАРВЕН. За 11 сакавіка ў гэтым раёне ўзята ў палон больш 2.000 нямецкіх салдат і афіцэраў.

Войскі 1-га БЕЛАРУСКАГА фронта, пасля ўпорных баёў, 12 сакавіка штурмам авалодалі горадам і крэпасцю КІСТЖЫНЬ (КЮСТРЫН) — важным вузлом шляхоў зносін і магутным апорным пунктам абароны немцаў на рацэ ОДЭР, які прыкрывае подступы да БЕРЛІНА.

У Венгрыі, на паўночным усходзе і ўсходзе ад возера БАЛАТОН, нашы войскі адбівалі атакі буйных сіл пяхоты і танкаў праціўніка і нанеслі яму вялікія страты. У баях за 11 сакавіка ў гэтым раёне агнём нашай артылерыі знішчана 54 нямецкія танкі і самаходныя гарматы і, апрача таго, падбіта і падарвалася на нашых мінных палях 27 танкаў і самаходных гармат праціўніка.

На другіх участках фронта—баі мясцовага значэння і пошукі разведчыкаў.

За 11 сакавіка на ўсіх франтах падбіта і знішчана 168 нямецкіх танкаў і самаходных гармат. У паветраных баях і агнём зенітнай артылерыі збіта 102 самалёты праціўніка.

НАЛЕТЫ НАШАЙ АВІЯЦЫІ НА ДАНЦЫГ, ГДЫНЮ І КЕНІГСБЕРГ

У ноч на 12 сакавіка нашы пяжкія бамбардыроўшчыкі нанеслі ўдар па ваенна-прамысловых аб'ектах у гарадах Данцыгу, Гдыні і Кенігсбергу. У выніку бамбардыроўкі ва ўказаных гарадах узніклі пажары, якія суправаджаліся выбухамі. Асабліва моцныя выбухі адзначаны ў Гдыні на тэрыторыі ваенных складаў і ў парту.

АПЕРАТЫЎНАЯ ЗВОДКА ЗА 13 САКАВІКА

На працягу 13 сакавіка на паўднёвым усходзе ад ДАНЦЫГА нашы войскі, наступаючы на поўнач уздоўж усходняга берага Вісты, занялі населеныя пункты РАЙМЕРСВАЛЬДЭ, НОЙТАЙХЕРВАЛЬДЭ, ФІРЦЭНХУБЕН, БРЭСКЕРФЕЛЬД, ПРАНГЕНАУ, НОЙКІРХ, ПАЛЬШАУ.

На паўночным захадзе ад горада ГДЫНІ нашы войскі занялі населеныя пункты РЭДА, ПОЛХАУ, БРЭЗІН, ОСЛАНІН, РУТЦАУ, ГНЕЗДАУ, ШВАРЦАУ, ХАЛЕРОВА, ХЛАПАУ. За 12 сакавіка ў гэтым раёне ўзята ў палон больш 1.000 нямецкіх салдат і афіцэраў.

На 1-м БЕЛАРУСКІМ фронце, у баях за горад і крэпасць КІСТЖЫНЬ (КЮСТРЫН), узята ў палон больш 3.000 нямецкіх салдат і афіцэраў. У ліку палонных камендант крэпасці КІСТЖЫНЬ палкоўнік КРУГЕР.

У Венгрыі, на паўночным усходзе і ўсходзе ад возера БАЛАТОН, немцы, не гледзячы на вялікія страты, прадаўжалі атакі буйнымі сіламі танкаў і пяхоты. У баях за 12 сакавіка ў гэтым раёне агнём нашай артылерыі знішчана 45 нямецкіх танкаў і самаходных гармат і, апрача гэтага, падбіта і падарвалася на нашых мінных палях 50 танкаў і самаходных гармат праціўніка.

На другіх участках фронта пошукі разведчыкаў і ў радзе пунктаў баі мясцовага значэння.

За 12 сакавіка на ўсіх франтах падбіта і знішчана 134 нямецкіх танкі і самаходных гарматы. У паветраных баях і агнём зенітнай артылерыі збіта 9 самалётаў праціўніка.

* * *

На паўднёвым усходзе ад Данцыга нашы войскі з баямі прасоўваліся на поўнач уздоўж усходняга берага ракі Вісла. Зрэзаная каналамі мясцовасць затрудняе наступальныя дзеянні совецкіх часцей. Апіраючыся на загадзя падрыхтаваныя абарончыя рубяжы і вельмі ўмацаваныя пункты, праціўнік аказвае ўпорнае супраціўленне. Немцы часта прадпрымаюць контратакі. Адбіваючы варожыя контратакі, нашы войскі нанеслі праціўніку вялікія страты. Часці Н-скага злучэння пераправіліся праз раку Лінау і выбілі немцаў з некалькіх населеных пунктаў.

* * *

На паўночным захадзе ад Гдыні нашы войскі занялі рад населеных пунктаў. Праціўнік, прыціснуты да Данцыгскай бухты, жорстка супраціўляецца. Совецкія пехацінцы, танкісты і артылерысты наносяць ворагу няспынныя ўдары і настойліва прасоўваюцца ўперад. Занят чыгуначны вузел Рэда, які знаходзіцца ў 13 кілометрах ад Гдыні. Жорсткія баі ідуць ля знешняга абводу данцыга-гдынскага ўмацаванага раёна. За дзень знішчана да 3.000 салдат і афіцэраў праціўніка. Падбіта і спалена 30 нямецкіх танкаў і самаходных гармат, знішчана 86 палявых гармат і звыш 700 аўтамашын. Нашымі часцямі захоплена ў немцаў 22 танкі і самаходныя гарматы, 68 палявых гармат, 15 шасціствольных мінамётаў і многа іншых трафеяў.

* * *

У Венгрыі, на паўночным усходзе і ўсходзе ад возера Балатон, буйныя сілы танкаў і пяхоты праціўніка прадаўжалі атакаваць нашы пазіцыі. Баі набываюць усё больш жорсткі характар і часта пераходзяць у рукапашныя схваткі. Не дабіўшыся поспеху на адным участку, немцы мяняюць напрамак удару, прабуючы знайсці слабае месца ў совецкай абароне. Аднак праціўнік на ўсіх участках сустракае ўпорнае супраціўленне нашых войск і нясе велізарныя страты.

Совецкія воіны, адбіваючы варожыя атакі, праяўляюць непахісную стойкасць і беззаветную храбрасць. Буйныя сілы пяхоты і 20 танкаў праціўніка атакавалі пазіцыі, якія абараняў стралковы батальён капітана Агаметава. Гітлераўцам удалося ўварвацца ў нашы траншэі. Капітан Агаметаў перагрупіраваў свае сілы і падняў байцоў у контратаку. Страціўшы 200 салдат забітымі і 6 танкаў, немцы адыйшлі на зыходны рубеж. На другім участку 14 варожых бронетранспарцёраў з аўтаматчыкамі набліжаліся да совецкіх пазіцый. Батарэя самаходных гармат старшага лейтэнанта Кікпіна, якая знаходзілася ў засадзе, адкрыла агонь і падбіла 2 нямецкія бронетранспарцёры. Гітлераўцы павярнулі назад. Праследуючы адступаючага праціўніка, нашы самаходныя гарматы знішчылі яшчэ 11 бронетранспарцёраў. Разведчыкі сяржанты Банкоў, Еромін і Крукусін пранікілі ў размяшчэнне праціўніка і заўважылі танк, укрыты ў засадзе. Нямецкія танкісты стаялі каля танка. Адважныя разведчыкі меткімі выстралами знішчылі гітлераўцаў. Сяржант Еромін завёў нямецкі танк і разам са сваімі таварышамі даставіў яго ў размяшчэнне сваёй часці.

* * *

Авіяцыяй Чырвонасцяжнага Балтыйскага флота патоплены ў Балтыйскім моры транспарт водазмяшчэннем у 12.000 тон і вартавы карабль праціўніка.

* * *

Узяты ў палон на 1-м Украінскім фронце ўнтэр-афіцэр баявой групы 408 нямецкай пяхотнай дывізіі Бруно Вібер паведаміў: «Наш полк панёс вялікія страты. Частка салдат разбеглася. Камандзір палка маёр Майер-Шолер аб'еднаў рэшткі разбітых падраздзяленняў у баявую групу. Камандзірам баявой групы быў назначаны маёр Герольд. Пасля ад'езду камандзіра палка ў штаб дывізіі маёр Герольд перадаў камандаванне баявой групай обер-лейтэнанту, былому лётчыку, які толькі напярэдадні прыбыў у полк, а сам паехаў. Праз гадзіну обер-лейтэнант таксама заявіў, што ён едзе ў штаб дывізіі прасіць дапамогі і перадаў камандаванне групай аднаму ўнтэр-афіцэру. Было ясна, што афіцэры ўцякаюць, каб выратаваць сваё жыццё, а нас кідаюць на волю лёсу. Я сабраў групу салдат. Мы зрабілі вывад, што калі будзем далей заставацца, то абавязкова загінем, і рашылі здацца ў палон».

У СОЎНАРКОМЕ БССР І ЦК КП(б) БЕЛАРУСІ

АБ ДЗЯРЖАЎНЫМ ПЛАНЕ РАЗВІЦЦЯ СЕЛЬСКАЙ ГАСПАДАРКІ БССР НА 1945 ГОД

Соўнарком БССР і ЦК КП(б) Беларусі адзначаюць, што калгасы, машынна-трактарныя станцыі і соўгасы Беларускай ССР, вызваленыя ад нямецкіх захопнікаў, дзякуючы высокаму палітычнаму і працоўнаму ўздыму, у цяжкіх умовах вайны і прыналіжным разарэнні сельскай гаспадаркі арганізавана правялі ў 1944 годзе ўборку ўраджаю, своечасова выканалі абавязацельствы перад дзяржавай і паспяхова правялі сяўбу азімых культур, што з'яўляецца важнай умовай далейшага арганізацыйна-гаспадарчага ўмацавання адноўленых калгасаў і соўгасаў.

Сялянскія гаспадаркі заходніх абласцей рэспублікі таксама паспяхова правялі сельскагаспадарчыя работы і поўнасцю выканалі свае абавязацельствы перад дзяржавай.

Совет Народных Камісараў БССР і Цэнтральны Камітэт КП(б)Б лічаць галоўнай задачай калгасаў, машынна-трактарных станцый, соўгасаў, зямельных органаў, партыйных і совецкіх арганізацый у галіне сельскай гаспадаркі — хутчэйшае аднаўленне і далейшае развіццё сельскай гаспадаркі рэспублікі з тым, каб у бліжэйшыя 2—3 годы забяспечыць аднаўленне даваенных размераў пасеўных плошчаў, павышэнне ўраджайнасці і павелічэнне валавога збору збожжа, бульбы і іншых сельскагаспадарчых прадуктаў.

Для паспяховага рашэння гэтай задачы совецкія і партыйныя арганізацыі, калгасы, машынна-трактарныя станцыі і соўгасы павінны сканцэнтраваць намаганні на правядзенне ў 1945 годзе наступных важнейшых мерапрыемстваў:

Забяспечанне своечасовай падрыхтоўкі да веснавых палявых работ калгасаў, МТС і соўгасаў для паспяховага выканання дзяржаўнага плана сяўбы яравых культур, павышэнне якасці палявых работ, палепшанне агратэхнікі вырошчвання ўсіх сельскагаспадарчых культур і, перш за ўсё, своечасовае правядзенне веснавой сяўбы па добра падрыхтаваных землях, пасеў добраякасным насеннем і забяспечанне належнага догляду пасеваў.

Асаблівая ўвага ў 1945 годзе павінна быць звернута на выкананне заданняў па ўзорванню і апрацоўцы папараў пад азімыя культуры, унясенне ў папары пад азіміну максімальнай колькасці арганічных угнаенняў, асабліва торфу, які з'яўляецца асноўным арганічным угнаеннем з прычыны недахвату гною, а таксама выкананне плана ўздыму зяблівы ў калгасах і соўгасах.

Правядзенне своечасовай падрыхтоўкі трактараў, сельскагаспадарчых машын і жывога цягла калгасаў, МТС і соўгасаў, падрыхтоўкі кадраў трактарыстаў, камбайнераў, механікаў, брыгадзіраў трактарных брыгад, умацаванне калгасных брыгад, палепшанне арганізацыі работы звенняў, упарадкаванне ўліку працы і прадукцыі, а таксама ўсямернае павелічэнне вырабу запасных частак да трактараў і сельскагаспадарчых машын прамысловымі прадпрыемствамі, райпромкамбінатамі, размешчанымі ў абласцях і раёнах.

Правільнае размяшчэнне сельскагаспадарчых культур па раёнах і калгасах з улікам прыродных і эканамічных умоў (забяспечанне цяглом і рабочай сілай, наяўнасць прадпрыемстваў, якія перапрацоўваюць сыравіну), правільнае планіраванне заданняў калгасам і соўгасам па ўраджайнасці сельскагаспадарчых культур, аднаўленне нарушаных і ўвядзенне новых севазваротаў з забяспечаннем правільнага размяшчэння сельскагаспадарчых культур па лепшых папярэдніках.

У сувязі з тым, што нямецкія захопнікі разбурылі насеннаводчую гаспадарку ў рэспубліцы, неабходна звярнуць выключную ўвагу на аднаўленне насеннаводства збожжавых, тэхнічных і гародніх культур, бульбы і траў.

Усямернае арганізацыйна - гаспадарчае ўмацаванне МТС, калгасаў і соўгасаў, аднаўленне разбуранага машынна-трактарнага парка, вытворчых і жылых пабудоў, стварэнне рамонтнай базы ў МТС, поўнага выкарыстання магутнасці ўсяго трактарнага парка, павышэнне якасці трактарных работ і выкананне ў агратэхнічных тэрміны вытворчых абавязацельстваў перад калгасамі, аднаўленне пасеўных плошчаў і ўпарадкаванне землекарыстання ў калгасах, а таксама расшырэнне пасеваў шматгадовых траў.

Для выканання пастановы Соўнаркома СССР і ЦК ВКП(б)—аб дзяржаўным плане развіцця сельскай гаспадаркі на 1945 год, Совет Народных Камісараў БССР і Цэнтральны Камітэт КП(б) Беларусі **пастанавілі:**

I. Аб плане сельскагаспадарчых работ па калгасах, калгаснікам і сялянскіх гаспадарках

1. Зацвердзіць пасеўную плошчу ўсіх сельскагаспадарчых культур па калгасах, калгаснікам і сялянскіх гаспадарках пад ураджай 1945 года з павелічэннем на 873,3 тысячы гектараў у параўнанні з 1944 годам.

2. Зацвердзіць па калгасах, калгаснікам і сялянскіх гаспадарках усходніх абласцей план сяўбы яравых культур на 1945 год, план сяўбы азімых культур пад ураджай 1946 года, план агратэхнічных мерапрыемстваў, план трактарных работ МТС, план ураджайнасці збожжавых, тэхнічных культур і бульбы, план насеннаводства гародніх культур і кораннеплодаў, план пакідання насеннікаў шматгадовых траў і выдзялення насенных участкаў ільну і канапель, план закладкі плодаягадных насаджэнняў і мерапрыемстваў па гароднінству, план закладкі і новага будаўніцтва парнікоў і цяпліц, план уборкі натуральных сенажацей і закладкі сілосу па абласцях і культурах.

3. Зацвердзіць план сельскагаспадарчых работ па сялянскіх гаспадарках заходніх абласцей БССР.

Соўнарком БССР і ЦК КП(б) Беларусі абавязваюць совецкія, партыйныя і зямельныя органы заходніх абласцей забяспечыць арганізацыйную і вытворчую дапамогу сялянскім гаспадаркам у падрыхтоўцы да веснавой сяўбы, яе правядзенні і выкананні іншых сельскагаспадарчых работ, а таксама аднавіць машынна-трактарныя станцыі і арганізаваць работу машынна-конных пракатных пунктаў для аказання ўсямернай дапамогі бядняцкім і маламоцным серадняцкім гаспадаркам.

4. Абавязаць Наркамзем БССР і выканкомы абласных Саветаў дэпутатаў працоўных:

а) у адпаведнасці з зацверджаным гэтай пастановай для абласці дзяржаўным планам, давесці ў 10-дзённы тэрмін да раёнаў, МТС, калгасаў, калгаснікаў і сялянскіх гаспадарак заданне па плану сельскагаспадарчых і трактарных работ на 1945 год;

б) на аснове ўстаноўленай гэтай пастановай сярэдняй ураджайнасці збожжавых культур Наркамзему БССР у 5-дзённы тэрмін прадставіць на зацверджанне СНК БССР і ЦК КП(б)Б заданні па кожнай вобласці па ўраджайнасці асобных збожжавых культур, а таксама заданні па ўраджайнасці тэхнічных, гародніх, кармавых, плодаягадных культур, па якіх ураджайнасць гэтай пастановай не зацверджана;

в) пры давядзенні планаў да раёнаў і калгасаў забяспечыць размяшчэнне сельскагаспадарчых культур у поўнай адпаведнасці з уведзенымі і ўвядзімымі севазваротамі і планам пераходу да іх, а таксама з улікам рабочай сілы і цягла, не дапускаючы пры гэтым перагрузкі тэхнічнымі і прапашнымі культурамі паасобных калгасаў.

II. Аб падрыхтоўцы да вясенне-палявых работ

1. СНК БССР і ЦК КП(б)Б абавязваюць совецкія, партыйныя і зямельныя органы забяспечыць своечасовую падрыхтоўку да веснавой сяўбы калгасаў, МТС і соўгасаў і арганізаванае правядзенне веснавой сяўбы ў лепшыя агратэхнічныя тэрміны пры добрай якасці палявых работ.

Устанавіць, што асноўнай задачай МТС з'яўляецца аднаўленне ўсіх паяўных трактараў да пачатку палявых работ, выкарыстанне ўсёй магутнасці трактарнага парка, павышэнне якасці трактарных работ і выкананне ў агратэхнічныя тэрміны вытворчых абавязацельстваў перад калгасамі.

2. Абавязаць Наркамзем БССР, Наркамсоўгасаў БССР, аблвыканкомы, райвыканкомы, абкомы і райкомы КП(б)Б забяспечыць:

а) Своечасовы і добраякасны рамонт і аднаўленне ўсіх трактараў і трактарнага інвентару ў кожнай МТС і соўгасе, а таксама рамонт і падрыхтоўку коннага інвентару, транспарту і збруі ў кожным калгасе і соўгасе.

Аказаць дапамогу МТС, калгасам, соўгасам у правядзенні рамонту трактараў, сельскагаспадарчых машын і прылад шляхам пасылкі з гарадоў і раённых цэнтраў рамонтных брыгад, а таксама рамонт сельгасмашын і інвентару ў майстэрнях райпромкамбінатаў і іншых прадпрыемствах.

Прыёмку трактараў з рамонту праводзіць дзяржаўным камісіям у саставе старшыні райвыканкома або сакратара райкома КП(б)Б (старшыня камісіі), дырэктара і старшага механіка МТС або соўгаса, старшага механіка суседняй МТС або соўгаса, а таксама старшага трактарыста, за якім замацаван трактар.

б) Правесці да пачатку сельскагаспадарчых работ дзяржаўную праверку гатоўнасці кожнай МТС да веснавых палявых работ камісіямі ў саставе сакратара райкома КП(б)Б, старшыні райвыканкома, загадчыка райземаддзела і дырэктара другой МТС, звярнуўшы асаблівую ўвагу на правільную расстаноўку кадраў пры арганізацыі трактарных брыгад, укамплектаванне брыгад прычэпным і заправачным інвентаром, інструментам, спраўнай бочка-тарай, запаснымі часткамі і падрыхтоўку МТС да тэхнічнага абслугоўвання трактараў у полі.

в) Устанавіць, як правіла, што да самастойнай работы ўпоў падрыхтаваныя трактарысты павінны дапускацца толькі пасля праходжання імі трохтыднёвай стажыроўкі на палявых работах пад кіраўніцтвам старшага трактарыста.

Звярнуць увагу на падрыхтоўку і павышэнне тэхнічнай кваліфікацыі трактарыстаў як да пачатку веснавых палявых работ, так і пасля заканчэння, шырока прымяняючы індывідуальнае навучанне.

г) Зрабіць да пачатку веснавых палявых работ нехапаючую колькасць заправачных пялежак і забяспечыць кожную трактарную брыгаду заправачным інвентаром, інструментам і прыстасаваннямі для тэхнічнага догляду трактараў і сельскагаспадарчых машын.

д) Шырока ўкараніць вопыт перадавых трактарных брыгад і калгасаў па будаўніцтву з мясцовых будаўнічых матэрыялаў у трактарных брыгадах сіламі трактарыстаў і калгасаў прасцейшых майстэрань, павецей для правядзення тэхнічнага догляду трактараў і па будаўніцтву прасцейшых скляпоў для захоўвання гаручага ў брыгадзе.

е) У адпаведнасці з заключанымі МТС з калгасамі дагаворамі, не пазней 1 красавіка 1945 года ўстанавіць для кожнай трактарнай брыгады гадавыя заданні па трактарных работах з указаннем калгасаў, відаў трактарных работ і тэрмінаў іх выканання, скласці рабочыя планы на перыяд веснавых палявых работ, а таксама ўручыць графік тэхнічнага догляду трактараў і сельскагаспадарчых машын па перыядах сельскагаспадарчых работ.

3. У мэтах ліквідацыі абязлічкі ў рабоце МТС і павышэння якасці трактарнай апрацоўкі калгасных палёў, абавязаць райвыканкомы і райкомы КП(б)Б і дырэктараў МТС да пачатку веснавой сяўбы правесці замацаванне трактарных брыгад на ўвесь перыяд палявых работ за адным або групай калгасаў.

4. Асаблівую ўвагу звярнуць на скарыстанне ўсіх наяўных газагенератарных трактараў, забяспечыць падбор і замацаванне для работы на газагенератарных трактарах найбольш вопытных трактарыстаў, нарыхтаваць і вывезці да месца работы поўнасцю забяспечваючую колькасць сухіх чурак.

5. У мэтах павышэння матэрыяльнай зацікаўленасці трактарыстаў у паскарэнні тэрмінаў веснавых палявых работ і палепшання скарыстання трактараў:

а) Захаваць на 1945 год выплату прэмій трактарыстам за выкананне ўстаноўленых 15-дзённых заданняў па веснавой сяўбе.

б) Захаваць парадак налічэння працадзён трактарыстам у падвойным размеры і павышэння норм выдаткавання гаручага на 10 процантаў у першыя 6 дзён работы на ворыве.

6. Абавязаць аблвыканкомы, райвыканкомы, абкомы, райкомы КП(б)Б і дырэктараў МТС:

а) Навесці парадак у нафтагаспадарцы МТС і ахове нафтапрадуктаў, прасякаючы спробы іх разбазарвання, незаконнага выдаткавання пад выглядам іншых гаспадарчых патрэб.

б) Забяспечыць завоз гаручага ў МТС да пачатку веснавога бездарожжа, аказваючы дапамогу МТС транспартам.

7. Соўнарком БССР і ЦК КП(б)Б лічаць, што засынка і ачыстка насенных фондаў у калгасах і соўгасах у размерах, якія поўнасцю забяспечваюць выкананне ўстаноўленага плана сяўбы на 1945 год, з'яўляецца важнейшай справай і абавязваюць Наркамзем і Наркомсоўгасаў БССР, аблвыканкомы, райвыканкомы, абкомы і райкомы КП(б)Б:

а) Забяспечыць да пачатку веснавых палявых работ поўную засыпку ў кожным калгасе насення збожжавых, тэхнічных, гародніх, кармавых культур і бульбы ў размеры, неабходным для выканання ўстаноўленага плана сяўбы, устанавіўшы пільны кантроль за якасцю і захаванасцю фондаў.

б) Правесці ў кожным калгасе і соўгасе поўную ачыстку, сартыроўку і давядзенне да ўстаноўленых кандыцый насенных фондаў па ўсіх культурах, а таксама своечасова праверыць насенне па ўсхожасць, вільготнасць, засмечанасць і на заражонасць хваробамі і шкоднікамі.

в) Забяспечыць да пачатку сяўбы поўнасцю абмен засычанага ў радзе калгасаў на насенне азімага жыта, на насенне яравых збожжавых і тэхнічных культур.

8. Абавязаць аблвыканкомы, райвыканкомы, абкомы і райкомы КП(б)Б забяспечыць:

а) Замацаванне рабочых коней і валоў на ўвесь перыяд палявых работ за паляводчымі брыгадамі, а ўнутры брыгад—за паасобнымі калгаснікамі.

б) Забраніраванне на перыяд веснавых палявых работ неабходнай колькасці сена і канцэнтраваных кармоў для рабочай жывёлы.

в) Заканчэнне не пазней 1 красавіка 1945 года складання вытворчых планаў у калгасах, МТС і соўгасах, заключэнне дагавораў МТС з калгасамі, а таксама рабочых планаў трактарных і паляводчых брыгад ў калгасах, соўгасах і МТС, прадугледзеўшы ў іх замацаванне за брыгадамі, калгаснікамі і рабочымі соўгасаў сродкаў вытворчасці, расстаноўку калгаснікаў і рабочых МТС і соўгасаў на асобных відах работ, а таксама ўстанаўленне на 1945 год норм выпрацоўкі і аплату працы.

г) Правядзенне праверкі і аказанне дапамогі калгасам у замацаванні за паляводчымі брыгадамі зямельных участкаў і выдзяленні да пачатку веснавых работ звенням палявых участкаў у натуры пад пасеў культур, якія замацоўваюцца за звеннямі.

д) Праверку за два тыдні да пачатку палявых работ гатоўнасці кожнага калгаса, МТС і соўгаса да веснавой сяўбы, шырока практыкуючы ўзаемную праверку.

9. Рэкамендаваць калгасам пры недахвапе цяглавай сілы выкарыстоўваць на лёгкіх палявых і транспартных работах малапрадуктыўных кароў калгасаў і калгаснікаў, забяспечыўшы клапатлівы догляд кароў. На вызеленых каровах калгаснікаў павінны, як правіла, прападаць калгаснікі, якім належаць гэтыя каровы.

Пры выкарыстанні на палявых і транспартных работах кароў калгаснікаў, забяспечыць выдзяленне неабходнай колькасці грубых кармоў для гэтых кароў.

10. Даручыць Наркамзему БССР, аблвыканкомам і абкомам КП(б)Б, у мэтах павелічэння цяглавых рэсурсаў калгасаў, у шырокіх размерах забяспечыць вырошчванне бычкоў для сельскагаспадарчых работ, на працягу месячнага тэрміну ўстанавіць для кожнага калгаса план вырошчвання бычкоў з разлікам, каб у бліжэйшыя два-тры годы кожны калгас меў не менш 10—15 пар рабочых валоў для палявых работ.

11. Абавязаць райвыканкомы, райкомы КП(б)Б, праўленні калгасаў і дырэктараў соўгасаў забяспечыць абавязковы ўдзел у сельскагаспадарчых работах усяго пражываючага ў калгасах і на тэрыторыі соўгасаў працаздольнага насельніцтва—калгаснікаў і членаў іх сем'яў, рабочых, служачых соўгасаў і членаў іх сем'яў, а таксама другога працаздольнага насельніцтва з некалгаснікаў, не занятага на рабоце ў прамысловасці або на транспарце.

12. За месяц да пачатку палявых работ вызваліць калгасы ад працугужпавіннасці і забараніць без дазволу Соўнаркома БССР якія-небудзь мабілізацыі цяглавай сілы з калгасаў.

Не пазней, чым за тры тыдні да пачатку палявых работ, паставіць жывое цягло на ўзмоцнены адкорм і адпачынак. Асоб, віноўных у незаконнай мабілізацыі жывой цяглавай сілы з калгасаў, прыцягваць да крымінальнай адказнасці.

13. Забараніць без дазволу Соўнаркома БССР выкарыстанне трактараў на транспартных і іншых палявых работах, за выключэннем падвозу гаручага для МТС.

III. Аб мерах павышэння ўраджайнасці

У мэтах далейшага палепшання якасці палявых работ і павышэння ўраджайнасці ўсіх сельскагаспадарчых культур, Соўнарком БССР і ЦК КП(б)Б абавязваюць Наркамзем БССР, Наркомсоўгасаў БССР, аблвыканкомы, райвыканкомы, абкомы і райкомы КП(б)Б, зямельныя органы на месцах, праўленні калгасаў, дырэктараў МТС і соўгасаў правесці наступныя важнейшыя мерапрыемствы:

1. У кожным калгасе і соўгасе да пачатку веснавых палявых работ распрацаваць сіламі агранамічнага персанала сумесна з праўленнямі калгасаў, дырэктарамі соўгасаў і вопытнымі калгаснікамі канкрэтныя агратэхнічныя мерапрыемствы па правядзенню веснавой сяўбы і догляду пасеваў у 1945 годзе.

Прадугледзець у гэтых мерапрыемствах правільнае размяшчэнне ўсіх культур у палях севазваротаў, а дзе севазваротаў няма, па лепшых для кожнай культуры папярэдніках, палепшанне якасці перадпасеўнай апрацоўкі палёў і правядзенне сяўбы ў лепшыя агратэхнічныя тэрміны для кожнай культуры з акуратнай задзелкай насення, максімальнае выкарыстанне мясцовых угнаенняў, правядзенне ў больш шырокіх размерах мер барацьбы з пустазеллем, шкоднікамі і хваробамі сельскагаспадарчых культур, палепшанне догляду пасеваў і апрацоўкі прапашных культур, асабліва такіх важнейшых культур, як лён-даўгунец, канапля, бульба, гароднінна, кок-сагыз.

Забараніць каму-б то ні было адмяняць або змяняць устаноўленыя калгасамі сумесна з агранамамі агратэхнічныя мерапрыемствы без ведама агранома, які ўстанавіў гэтыя мерапрыемствы, або без дазволу галоўнага агранома раённага зямельнага аддзела, па соўгасах—без дазволу галоўнага агранома.

Соўнарком БССР і ЦК КП(б)Б асабліва звяртаюць увагу на неабходнасць безумоўнага выканання дзяржаўных планаў пад'ёму і апрацоўкі чыстых папараў, запраўкі папараў арганічнымі ўгнаеннямі і ўзорвання зяблівы, без чаго нельга ліквідаваць вялікую засмечанасць палёў, якая ўтварылася за час вайны ў многіх раёнах, і дабіцца сур'ёзнага павышэння ўраджайнасці.

2. У мэтах забяспечання ўстойлівага і высокага ўраджаю ў калгасах і соўгасах, мабілізаваць усе сілы і сродкі калгасаў, МТС і соўгасаў, перш за ўсё на максімальнае накапленне і зберажэнне вільгаці ў глебе і прымяненне агратэхнікі, якая-б забяспечыла атрыманне ў 1945 годзе высокага ўраджаю ў калгасах і соўгасах, для чаго:

а) Забяспечыць правядзенне на зяблеве, чорных папарах, а таксама ўчастках пасля прапашных культур, неўзараных з восені, баранаванне ў 1—2 сляды, з тым, каб паверхня глебы была прыкрыта рыхлым (ахоўным ад высушэння) пластам глебы не менш 1—2 сантыметраў.

На ўчастках, якія падлягаюць веснавому ўзорванню, а таксама прызначаных для ўзорвання пад папары, закрываць у першыя веснавыя дні вільгаць шляхам мелкага, на глыбіню 3—5 сантыметраў, лушчэння-рыхлення глебы ў 1—2 сляды.

У сувязі з тым, што барацьба за захаванне вільгаці і знішчэнне пустазелля з'яўляецца адным з важнейшых мерапрыемстваў барацьбы за ўраджай, выкарыстаць усю наяўнасць трактараў і жывога цягла адразу-ж па меры паспявання глебы для закрыцця вільгаці.

б) Правесці мерапрыемствы, якія-б забяспечылі своечасовы рамонт у калгасах, МТС і соўгасах шыроказахопных трактарных і конных глебазапрацоўчых прылад (лушчыльнікі, дыскавыя бораны, культыватары, драпачы, драўляныя бораны з доўгімі жалезнымі зуб'ямі і г. д.) і ўстанавіць заданне прадпрыемствам мясцовай прамысловасці, МТС, МТМ, соўгасам і калгасным кузням па рамонту, аднаўленню і вырабу новых прасцейшых прылад для рыхлення-лушчэння глебы.

в) Палі, засмечаныя корневішчавым і корнеадросткавым пустазеллем (пырнік, асот і інш.), узорваць вясной у першую чаргу на нармальную глыбіню. На папярэдне ўзлушчаных, рыхлёных палях, калі яны не засмечаны корневішчавым і корнеадросткавым пустазеллем, а аднагадовае пустазелле (аўсюг і інш.) ужо дало ўсходы, у мэтах паскарэння сяўбы дапускаць узорванне на глыбіню 10—12 сантыметраў з добрым абаротам пласта, праводзячы баранаванне ўслед за ворывам, забараніўшы без папярэдняга лушчэння-рыхлення ворыва на глыбіню 10—12 сантыметраў.

3. Забяспечыць своечасовае правядзенне догляду пасеваў азімых культур у веснавы перыяд: баранаванне пасеваў, падкормку іх, а таксама праполку пасеваў, уключыўшы гэтыя мерапрыемствы ў рабочыя планы веснавой сяўбы.

4. Удзяліць асаблівую ўвагу палепшанню догляду пасеваў, у асаблівасці прапашных культур, аказаць дапамогу калгасам і соўгасам шляхам пасылкі з гарадоў і райцэнтраў працаздольнага насельніцтва і моладзі для правядзення праполачных работ і міжрадковай апрацоўкі прапашных культур.

5. У мэтах максімальнага накаплення і правільнага выкарыстання ўгнаенняў абавязаць совецкія, партыйныя і зямельныя органы:

а) Устанавіць для кожнага калгаса план унясення мясцовых угнаенняў у 1945 годзе з указаннем плошчы, якая ўгнойваецца, прадугледзеўшы поўнае выкарыстанне гною, перагною, гноевай жыжы, попелу, птушынага памёту і асабліва торфу і першачарговае іх унясенне пад тэхнічныя і гароднія культуры, бульбу, насенныя ўчасткі збожжавых культур, а таксама ў папары і пад азімае збожжа.

б) Арганізаваць выкарыстанне на ўгнаенне адыходаў прамысловасці і бытавых адкідаў гарадоў, аказваючы калгасам дапамогу гарадскім транспартам для вывазкі гэтых угнаенняў.

г) Забяспечыць вывазку мінеральных угнаенняў са складаў Сельгасснаба, прыстанцыйных і прыстанскіх пунктаў і выкарыстанне іх у першую чаргу пад тэхнічныя культуры і на асушаных тарфяных землях.

6. Абавязаць Наркамзем БССР, аблвыканкомы і абкомы КП(б)Б дабіцца рэзкага павелічэння пасеваў лубіну, увесь наяўны лубін выкарыстаць для вырошчвання насення, забяспечыць пільны догляд пасеваў лубіну і к канцу 1945 года стварыць запасы насення для сяўбы на насенне і зялёнае ўгнаенне па калгасах усходніх абласцей на плошчы не менш 50,0 тысяч гектараў і заходніх абласцях—100,0 тысяч гектараў.

7. Абавязаць Наркамзем БССР, совецкія, партыйныя і зямельныя органы на месцах забяспечыць выдзяленне ва ўстаноўленых размерах насенных участкаў па кожнай культуры ў кожным калгасе да пачатку веснавой сяўбы і замацаванне гэтых участкаў за паасобнымі звеннямі, правядзенне на выдзеленых насенных участках высокай агратэхнікі—сяўбу лепшым гатунковым насеннем па зяблеваму ўзорванню або папарах у лепшыя агратэхнічныя тэрміны; а таксама правядзенне належнага догляду пасеваў на насенных участках і афармленне актамі выдзеленых насенных участкаў.

Ускладзі адказнасць за правільнае выдзяленне і захоўванне ўстаноўленай агратэхнікі на насенных участках у калгасах на агранамаў-насеннаводаў райземаддзелаў і старшынь калгасаў.

8. На працягу 1945 года правесці ва ўсіх калгасах, якія маюць севазварот, праверку захаванасці ў натуры межаў палёў і межавых знакаў і правільнасць размяшчэння культур у адпаведнасці з прынятым чаргаваннем і планамі пераходу да севазваротаў.

У калгасах, дзе севазвароты былі нарушаны нямецкімі захопнікамі і да гэтага часу не адноўлены і дзе планаў пераходу да севазваротаў няма,—скласці і ўдакладніць планы пераходу да севазваротаў, а таксама неадкладна прыступіць да аднаўлення межаў палёў севазваротаў і ўдакладнення межавых знакаў.

9. У мэтах хутчэйшага асваення севазваротаў і шырокага прымянення ў іх рэкамендаваных акадэмікам Вільямсам пасеваў травасумесей бабовых і злакавых шматгадовых траў, забяспечыць з 1945 года пасеў на насенне шматгадовых траў у кожным калгасе і соўгасе з тым, каб у бліжэйшыя два-тры годы калгасы і соўгасы маглі поўнасцю забяспечыць сяўбу траў у севазваротах сваім насеннем, арганізаваць агратэхнічную дапамогу калгасам у справе авалодання агратэхнікай шматгадовых траў, атрыманне высокіх ураджаяў сена і насення траў і больш хуткага асваення севазваротаў.

Усе плошчы шматгадовых траў, якія захаваліся ў калгасах і соўгасах, адвесці пад насеннікі і ўстанавіць іх належны догляд, дабіваючыся атрымання максімальнага ўраджаю.

10. У мэтах хутчэйшага аднаўлення пасеваў яравой пшаніцы дазволіць калгасам у 1945 годзе размеры насенных участкаў яравой пшаніцы павялічыць да 20 процантаў ад фактычнай пасеўнай плошчы. Устанавіць, што пасевы яравой пшаніцы размяшчаюцца ў першую чаргу на палінных і шматгадовых залежных землях, узораных пад зяблева, пасля азімых, пасевы якіх праводзіліся па чыстых папарах, а таксама па ўгноеных землях з-пад бульбы.

11. Устанавіць, што да ўзорвання папараў пад азімыя культуры трэба прыступаць па меры заканчэння веснавой сяўбы з тым, каб закончыць узорванне не пазней 15 ліпеня.

Абавязаць аблвыканкомы, райвыканкомы, абкомы і райкомы КП(б)Б, дырэктараў МТС па меры вызвалення жывой цяглавай сілы і трактараў на веснавой сяўбе забяспечыць выдзяленне адпаведнай колькасці трактараў і жывога цягла на пад'ём папараў з тым, каб закончыць іх узорванне ва ўстаноўленыя тэрміны.

Паставіць перад совецкімі, партыйнымі і зямельнымі органамі задачу ўнясення ў папары пад азімыя арганічных угнаенняў, торфагноевага кампосту не менш 20—25 тон на кожны гектар.

12. У мэтах павышэння ўраджайнасці грэчкі, абавязаць мясцовыя совецкія, партыйныя і зямельныя органы звярнуць асаблівую ўвагу на забяспечанне правільнай перадпасеўнай апрацоўкі глебы на ўчастках, якія адводзяцца пад пасеў грэчкі, правядзенне ў ранніх тэрміны пакроўнага баранавання, культывацыі зяблева, вясенняга ўзорвання і знішчэнне пустазелля шляхам дадатковых культывацый і пераўзорвання глебы перад сяўбой грэчкі.

Рэкамендаваць калгасам праводзіць сяўбу грэчкі ў добра прагрэтую глебу ў 2—3 тэрміны, каб забяспечыць атрыманне высокага ўраджаю грэчкі. Расшырыць прымяненне ў калгасах вывазкі пчол у вуллях на грэчневыя палі.

IV. Аб мерапрыемствах па аднаўленню сельскай гаспадаркі заходніх абласцей БССР

Соўнарком БССР і ЦК КП(б)Б абавязваюць партыйныя, совецкія і зямельныя органы заходніх абласцей БССР:

1. Ліквідаваць марудлівасць у выраўнанні важнейшага пытання ў сельскай гаспадарцы заходніх абласцей—надзяленні зямлёй беззямельных і малазямельных сялян.

Аднавіць устаноўленыя ў 1941 годзе совецкім урадам прэдзельныя нормы землекарыстання на адзін сялянскі двор у заходніх абласцях БССР, у выніку чаго шматлікія масы беззямельных і малазямельных сялян заходніх абласцей павінны атрымаць у сваё карыстанне зямлю.

Вярнуць сялянам усю зямлю, атрыманую імі на аснове законаў совецкай улады ў перыяд 1939—41 г.г. і адабраную ў іх нямецкімі захопнікамі і іх саўдзельнікамі.

Правесці надзяленне сялян зямлёй, як палітычнае мерапрыемства, якое забяспечвае далейшае згуртаванне працоўных заходніх абласцей вакол органаў совецкай улады.

2. Совет Народных Камісараў БССР і ЦК КП(б) Беларусі ставяць перад совецкімі, партыйнымі і зямельнымі органамі заходніх абласцей БССР адну з важнейшых задач—расшырэнне пасеўных плошчаў, асабліва збожжавых культур, бульбы, пасеваў ільну, выкарыстанне пад узорванне ўсіх залежных і пераложных зямель і правядзенне сельскагаспадарчых работ на высокім агратэхнічным узроўні, які-б забяспечваў атрыманне высокіх ураджаяў.

3. Соўнарком БССР і ЦК КП(б) Беларусі звяртаюць увагу совецкіх, партыйных і зямельных органаў заходніх абласцей БССР на неабходнасць аказання ўсямернай дапамогі сялянскім бядняцкім і серадняцкім гаспадаркам, якія аказаліся разаронымі ў выніку нямецкай акупацыі. Неабходна дапамагчы гэтым гаспадаркам падрыхтавацца і паспяхова правесці веснавую сяўбу.

Бясконным гаспадаркам аказаць дапамогу ў апрацоўцы зямлі, для чаго ва ўсіх раёнах аднавіць машынна-трактарныя станцыі, адрамантаваць усе паяўныя трактары і арганізаваць машынна-конныя пракатныя пункты, шырока арганізаваць сялянскую ўзаемадапамогу ў апрацоўцы і абсемяненні зямель.

Совет Народных Камісараў БССР і Цэнтральны Камітэт КП(б) Беларусі лічаць, што выкананне плана развіцця сельскай гаспадаркі на 1945 год з'яўляецца важнейшай ваенна-гаспадарчай задачай совецкіх, партыйных арганізацый, зямельных органаў, калгасаў, МТС і соўгасаў, комуністаў і комсамольцаў, агранамаў, калгаснікаў і калгасніц, сялян заходніх абласцей, рабочых і служачых у справе забяспечання Чырвонай Арміі і насельніцтва прадуктамі харчавання, а прамысловасці сыравінай.

ПАРТЫЙНАЕ ЖЫЦЦЁ

НА СХОДАХ КОМУНІСТАЎ

Мазыр

Адбыўся агульнагарадскі сход комуністаў, на якім прысутнічала 479 членаў і кандыдатаў КП(б)Б. На парадку дня адно пытанне—вынікі работы VI пленума ЦК КП(б)Б. З дакладам па гэтаму пытанню выступіў сакратар Палескага абкома партыі тав. Былінскі.

— VI пленум ЦК КП(б)Б,—гаворыць дакладчык,—паставіў перад беларускай партыйнай арганізацыяй вялікія задачы па мабілізацыі ўсіх сіл партыі і беларускага народа на ўсямернае аказанне дапамогі Чырвонай Арміі, на хутчэйшае адраджэнне разбуранай немцамі народнай гаспадаркі і культуры.

— Нямецкія нягоднікі,—адзначае далей тав. Былінскі,—нанеслі цяжкія раны народнай гаспадарцы Палесся, у тым ліку і нашаму гораду Мазыру. Яны поўнасцю разбурылі прамысловасць, сельскую гаспадарку, вывезлі ўсе каштоўнасці. Толькі ў адным Мазыры яны разбурылі 381 будынак.

З першага дня свайго вызвалення Мазыр пачаў адраджацца. Працоўныя горада, былыя партызаны пад кіраўніцтвам партыйных арганізацый у кароткі тэрмін адновілі электрастанцыю, вадаправод, хлебакамбінат і рад іншых прадпрыемстваў. Праведзена значная работа па аднаўленню ўсёй комунальнай гаспадаркі.

— Аднак,—адзначае далей дакладчык,—праведзеная работа па аднаўленню народнай гаспадаркі горада зусім недастатковая ў параўнанні з магчымасцямі, якія ў нас ёсць.

Асабліва нездавальняючае становішча з адраджэннем прамысловасці горада. Гарадскі камітэт партыі і яго сакратары тт. Напрэеў і Беляеў займаліся гэтым пытаннем павярхоўна. Вось факт: кіраўнікі горада намячалі безліч тэрмінаў пуску першай чаргі новай гарадской электрастанцыі. Усе тэрміны пуску першай чаргі гэтай станцыі даўно прайшлі, а на будаўніцтве новай ГЭС непачаты край работы і пуск яе недапушчальна зацягваецца. Гэта тлумачыцца толькі тым, што гарадскі камітэт партыі і горсавет мала цікавіліся ходам аднаўленчых работ на электрастанцыі і не кіравалі імі, не кантраліравалі выкананне сваіх жа рашэнняў. Іменна гэта прывяло да таго, што дырэктар ГЭС тав. Лебедзеў сарваў неаднаразова намячаемыя тэрміны пуску электрастанцыі, не асвойвае адпушчаных дзяржавай сродкаў.

Няма зруху і па будаўніцтве камбіната стандартных дамоў. Тут яшчэ трэба правесці многа падрыхтоўчых работ. Дрэнна працуе і швейная фабрыка індывідуальнага пашыву, прамысловыя арцелі промкаперацыі. Большасць прамысловых прадпрыемстваў і арцелей горада з месяца ў месяц не выконваюць вытворчых планаў.

Не праяўляў гарадскі камітэт КП(б)Б ініцыятывы і распарадчасці ва ўпарадкаванні горада. Больш таго, добры пачын мазыран па адраджэнню роднага горада не быў своечасова падтрыман. У выніку пасля трох-чатырох нядзельнікаў аднаўленчыя работы ў горадзе зусім спыніліся.

У гаркоме партыі, у горсавеце выносілі многа рашэнняў па пытанню ўпарадкавання горада. Аднак з-за адсутнасці кантролю за іх выкананнем ні адно з гэтых рашэнняў не ажыццёўлена. Іменна гэта прывяло да таго, што горад сустрэў зіму непадрыхтаваным.

Да такога становішча прывяло фармальнае партыйнае кіраўніцтва. Бескантрольнасць за выкананнем рашэнняў выявілася ў тым, што па горхарчгандлю з вынесеных 15 пастаноў не ажыццёўлена ні адна. Горхарчгандаль (дырэктар тав. Гонікман) і да сёнешняга дня працуе нездавальняюча.

Комуністы тт. Марозаў, Агееў, Смірноў, Ледзянёў, Лявіцкі, Барсукоў і другія ў сваіх выступленнях востра крытыкавалі работу гаркома партыі і горсавета.

Усяго ў спрэчках выступіла 20 чалавек.

У прынятым рашэнні партыйны сход намеціў рад канкрэтных мерапрыемстваў па выкананню рашэнняў VI пленума ЦК КП(б)Б, па хутчэйшаму адраджэнню народнай гаспадаркі абласці і палепшанню ўсёй работы гарадской партыйнай арганізацыі.

(Кар. «Звязды»).

Баранавічы

Адбыўся агульны сход комуністаў горада Баранавічы. Сход абмеркаваў задачы гарадской партыйнай арганізацыі па рэалізацыі пастановы ЦК ВКП(б) аб палітычнай рабоце партыйных арганізацый сярод насельніцтва заходніх абласцей БССР і рашэнняў VI пленума ЦК КП(б)Б.

З дакладам па гэтаму пытанню выступіў сакратар Баранавіцкага абкома КП(б)Б тав. Тур.

— Аднаўляючы разбураную немцамі народную гаспадарку,—гаворыць дакладчык,—працоўныя гор. Баранавічы ні на мінуту не забываюць аб патрэбах сваёй вызваліцельніцы—Чырвонай Арміі. За кароткі тэрмін у горадзе былі адноўлены і далі прадукцыю для фронта дзесяткі прамысловых прадпрыемстваў і арцелей. У рэкордна кароткія тэрміны рабочыя чыгункі пад кіраўніцтвам партыйнай арганізацыі аднавілі ўшчэнт разбураны немцамі чыгуначны вузел. Зараз на важнейшай франтавой магістралі нашым воінам на фронт дастаўляюцца ўзбраенне, боеприпасы і ўсё, што ім патрэбна для разгрому нямецка-фашысцкіх акупантаў. Чыгунка ў цэлым і паасобныя гаспадарчыя адзінкі яе ва ўсесаюзным социялістычным спаборніцтве неаднаразова заваёўвалі Пераходны Чырвоны Сцяг Дзяржаўнага Камітэта Абароны і Народнага Камісарыята Шляхоў Зносін.

— Аднак, — гаворыць тав. Тур,—за апошні час на чыгуначным вузле Баранавічы ёсць буйныя недахопы. Дрэнна скарыстоўваюцца паравозы, не выконваюцца сутачныя планы пагрузкі, зрываецца графік руху паяздоў.

За прайшоўшыя 8 месяцаў пасля вызвалення горада ад нямецкіх акупантаў зроблена нямала па забяспечанню насельніцтва горада прадуктамі харчавання і прадметамі першай неабходнасці. Адноўлены 153 жылыя дамы агульнай плошчай у 22.600 квадратных метраў.

На масавых нядзельніках, якія праводзіліся пад кіраўніцтвам гарадской партыйнай арганізацыі, працоўнымі горада сабрана поўмільёна штук цэглы, 217 кубаметраў шчэбня і 270 тон іншых будаўнічых матэрыялаў.

— Нашы поспехі,—гаворыць далей дакладчык,—маглі-б быць значна большымі, калі-б усе гарадскія партыйныя арганізацыі па-большэвіцку змагаліся за рэалізацыю пастановы ЦК ВКП(б) аб бліжэйшых задачах партыйных арганізацый Беларусі ў галіне палітычна-масавай і культурна-асветнай работы сярод насельніцтва.

Гарком КП(б)Б недастаткова кіраваў пярвічнымі партарганізацыямі, слаба кантраліраваў іх палітмасавую і культурна-асветную работу сярод насельніцтва. Недастаткова праводзіцца палітмасавая і выхаваўчая работа сярод інтэлігенцыі горада. Партарганізацыя ўсё яшчэ недастаткова кіруе комсамолам. Вынікам нездавальняючай пастаноўкі выхаваўчай работы сярод моладзі з'яўляецца слабы рост комсамола.

Комуністы, праводзячы масавую работу сярод насельніцтва, зусім недастаткова выкрываюць варожы твар беларуска-нямецкіх і польска-нямецкіх нацыяналістаў—саўдзельнікаў гітлераўскіх злачынцаў на тэрыторыі абласці. У агітацыйнай рабоце не скарыстоўваюцца факты пра крывавыя злачынствы нямецкіх акупантаў, пра лагеры смерці ў Калдычаве, Лясной, Баранавічах, Слоніме, дзе па-зверску знішчаны дзесяткі тысяч лепшых сыноў і дочак беларускага народа.

Выступіўшыя ў спрэчках таварышы падзяліліся вопытам сваёй работы, ускрылі рад сур'ёзных недахопаў, рэзка крытыкавалі работу гаркома КП(б)Б.

Тав. Бурый у сваім выступленні крытыкаваў работу гаркома КП(б)Б і другіх гарадскіх кіруючых арганізацый, якія марудзяць з разгортваннем будаўніча-аднаўленчых работ.

Пытанням разгортвання палітычна-масавай работы сярод насельніцтва прысвяцілі свае выступленні тт. Сцепухін, Марозава, Мілашэнка, Шапохіна і другія.

На сходзе выступіў сакратар ЦК КП(б)Б тав. Гарбуноў.

Сход прыняў разгорнутую пастанову, накіраваную на хутчэйшае выкананне пастановы ЦК ВКП(б) аб палітычнай рабоце сярод насельніцтва заходніх абласцей БССР і рашэнняў VI пленума ЦК КП(б)Б.

Аднаўляецца завод „Дабееўскі Мох"

Перад Айчыннай вайной у Віцебскай вобласці будаваўся буйны торфабрыкетны завод «Дабееўскі Мох». У 1942 годзе ён павінен быў даць 50 тысяч тон брыкетнага паліва для прамысловасці і насельніцтва рэспублікі.

На заводзе была створана механічная майстэрня, кантора, рабочыя пасёлкі. Вяліся паскораныя работы па пабудове чыгункі завода і балотна-падрыхтоўчыя работы. Завод меў багаты транспарт.

Нямецка-фашысцкія захопнікі на месцы завода пакінулі руіны. Увесь запас будаўнічых матэрыялаў і транспартныя сродкі спалілі або вывезлі.

Пасля выгнання нямецкіх захопнікаў гэтае прадпрыемства адразу адновіла сваю дзейнасць. Пачалося будаўніцтва чыгункі. Паскоранымі тэмпамі вядуцца балотна-падрыхтоўчыя работы. Ужо вырыта 8,4 тысячы кубаметраў магістральных канаў. Для аблягчэння працы рабочых і павелічэння яе прадукцыйнасці мёрзлая зямля, якая перашкаджае зімой рыць канавы, узрываецца. Такім-жа спосабам робіцца выемка на будаўніцтве чыгункі.

Рабочыя па-сапраўднаму ўзяліся за аднаўленне свайго прадпрыемства. Лепшыя з іх штодзённа перавыконваюць свае нормы. Сярод іх—тт. Якушаў, Рубінаў і другія, якія выконваюць план на 130—140 процантаў.

Да сезона 1945 года завод «Дабееўскі Мох» павінен поўнасцю закончыць будаўніцтва і даваць рэспубліцы 50 тысяч тон торфабрыкету ў год.

Ф. МАЛЫШАЎ.

На выстаўцы ў бібліятэцы імені Леніна

У Дзяржаўнай бібліятэцы імені В. І. Леніна нядаўна адкрыта пастаянная выстаўка «Вялікая Айчынная вайна ў літаратуры».

На выстаўцы ёсць 13 аддзелаў: гераічнае мінулае рускага народа, героі Айчыннай вайны, народныя мсціўцы, гарады-героі, комсамол у баях за Радзіму, совецкія жанчыны ў Айчыннай вайне, адзінства фронта і тыла і іншыя. Тут сабраны тысячы кніг, фотаздымкі, ілюстрацыі, партрэты, плакаты і асобныя дакументы.

Кніга таварыша Сталіна «Аб вялікай Айчыннай вайне Совецкага Саюза» знаходзіцца ў цэнтры выстаўкі, у розных выданнях. Побач падабраны ўсе прапагандысцкія матэрыялы, неабходныя для вывучэння кнігі таварыша Сталіна. Тут-жа ёсць літаратура аб арганізатарах Чырвонай Арміі В. І. Леніне, І. В. Сталіне, аб вялікім палкаводцы — Вярхоўным Галоўнакамандуючым І. В. Сталіне.

У аддзеле «Гераічнае мінулае рускага народа» ёсць многа гістарычнай і мастацкай літаратуры аб вялікіх рускіх палкаводцах—Александру Неўскім, Дзімітрыю Данскім, Пажарскім, Мініне, Суораве, Кутузаве. Цікавыя літаграфіі, як «Лядовае пабоішча», «Кулікоўская бітва», «Барадзінская бітва» і іншыя дапаўняюць гэты аддзел і яшчэ больш яскрава паказваюць гістарычныя бітвы з чужаземнымі захопнікамі за незалежнасць нашай Радзімы. У гэтым аддзеле выстаўлены кнігі аб Фрунзе, Чапаеве, Пархоменка, Шчорсе і другіх.

Вялікае месца займае на выстаўцы мастацкая літаратура, прысвечаная Айчыннай вайне. Тут ёсць кнігі лепшых совецкіх майстраў мастацкага слова: Гросмана «Народ бяссмертны», Собалева «Марская душа», Эрэнбурга «Вайна», Гарбатава «Апавяданні аб салдацкай душы», Шолахава «Яны змагаліся за Радзіму», зборнікі К. Сімонава і многія іншыя кнігі.

Асобна сабраны мастацкія творы беларускіх пісьменнікаў аб вялікай Айчыннай вайне. Сярод іх кнігі, надрукаваныя Белдзяржвыдавецтвам: Я. Купалы «Вершы аб Радзіме», А. Куляшова «Сцяг брыгады», М. Машары «Беларусь», А. Стаховіча «Шумяць лясы», М. Танка «Янук Сяліба» і мастацкія зборнікі «Беларусь у агні», «Беларусь змагаецца».

Увагу звяртаюць 15 літаграфій мастака Чэхава, якія знаходзяцца ў аддзеле «Злодзеянні нямецка-фашысцкіх разбойнікаў».

На выстаўцы прадстаўлен аддзел «Героі Айчыннай вайны». Сотні кніг аб няўміручых подвігах сыноў совецкага народа дапоўнены шматлікімі фотаілюстрацыямі і карцінамі. У аддзеле «Народныя мсціўцы» шырока паказан партызанскі рух у Беларусі.

Істотным недахопам выстаўкі з'яўляецца адсутнасць раздзела аб палкаводцах Айчыннай вайны. Няма і карты, якая-б яскрава паказвала гераічны шлях нашай Чырвонай Арміі ад берагоў Волгі да Одэра і далей, на якой было-б відаць, што совецкія воіны ўжо блізка падыйшлі да Берліна.

Выстаўка ў бібліятэцы імені Леніна, не гледзячы на некаторыя недахопы, дапаможа нашым партыйным кадрам, асабліва прапагандыстам, навуковым работнікам, студэнтам, а таксама кожнаму грамадзяніну нашай Радзімы глыбей пазнаёміцца з гісторыяй вялікай Айчыннай вайны, са шматлікімі матэрыяламі аб вялікай гістарычнай місіі Чырвонай Арміі.



Заканчваючы рамонт трактараў і прычэпнага інвентара, трактарысты - рамонтнікі Крупскай МТС наладзілі рамонт плугоў і барон навакольным калгасам.
На здымку: калгасныя плугі, адрамантаваныя ў кузні Крупскай МТС.
Фото Л. Мазелева.

У МАЙСТЭРНЯХ ВУЧЫЛІШЧА

Было 7 гадзін раніцы. Вялікая пляцоўка двара рамеснічкага вучылішча № 12 горада Ліда напоўнілася гоманам. Вучні стаялі ў шарэнгах. «Смірна!»—раздалася каманда ваеннага кіраўніка тав. Тарасевіча. Пачыналася фізічная зарадка.

Зусім нядаўна прышлі яны сюды. Прышлі з вёсак, дзіцячых дамоў, з партызанскіх атрадаў. Некаторыя з іх удастоены ўрадавых узнагарод. На грудзях маладых патрыётаў, былых народных мсціўцаў Шульгі, Драздоўскага, Пусека і другіх красуюцца медалі «Партызану Айчыннай вайны».

Совецкая ўлада паклапацілася аб тых, у каго фашысты забілі блізкіх, родных.

— Дружна жылі мы да вайны,—расказвае выхаванец вучылішча Дубін.—Я вучыўся ў школе, бацька і маці працавалі. Вечарамі, калі ўся сям'я збіралася дамоў, у нас было так прыемна. Многа я думаў аб сваім будучым жыцці, марыў стаць слесарам... Цяпер мае мары здзейсніліся.

І калі ён пачынае расказваць пра смерць сваіх блізкіх, твар яго робіцца суровым, вочы напаўняюцца гневам помсты ворагу. У дружным калектыве вучылішча Дубін адчуў бацькоўскія клопаты і мацярынскую ласку. Совецкая дзяржава ўзяла яго на сваё поўнае ўтрыманне.

Восем гадзін раніцы. Сігнал на спеданне. Арганізавана, групамі ўваходзяць вучні ў сталовую.

У дзевяць гадзін пачатак заняткаў. Групы сталяроў, слесараў і токараў займаюць свае месцы. Вучні слясарнага аддзялення асвоілі распілоўку і рэзку метала і прыступілі да вырабу інструменту. Кожны вучань гэтага аддзялення ўжо самастойна вырабляе малаткі і бабкі для клянання кос. Значных поспехаў у рабоце дасягнулі вучні Комалаў, Чакураў, Мошка, Закрэўскі. 200 процантаў нормы—дзённы паказчык іх работы.

Група сталяроў за кароткі час асвоіла праспейшую апрацоўку дрэва і ўжо зараз вырабляе табурэткі і сталы. Маладыя столяры з кожным днём удасканальваюць свае спецыяльнасці. Хутка яны прыступяць да вырабу складаных драўляных рэчаў.

Не адстаюць і токары. Пад кіраўніцтвам сваіх вопытных майстраў яны навучыліся такарнай справе, працаваць на станках. Спачатку вучні абтачвалі простыя дэталі, вучыліся працаваць па чарцяжах. Пастойлівасць у вучобе не прайшла даремна. Будучыя токары ўжо цяпер вырабляюць конусы для калёсных восей і іншыя складаныя рэчы. Неабходна адзначыць, што ў групе няма ніводнага вучня, які-б не выконваў задання. Спаборнічаючы паміж сабой, вучні дабіваюцца выканання і перавыканання норм. У авангардзе ідуць комсамольцы. На 200—250 процантаў выконваюць дзённае заданне члены ЛКСМБ тт. Смычкова, Пуўсеп, Тумарава. Яны дапамагаюць сваім таварышам у рабоце.

Шумам такарных станкоў, стукам малаткоў і звонам піл напоўнены пэхі майстэрань. Столяры, токары і слесары, захапіўшыся работай, не чулі сігналу на абедзенны перапынак.

Абед прадаўжаўся дзве гадзіны.

І вось зноў пасля перапынку з пэхаў майстэрань вырваўся шум працы. Малады прадвясенні вецер падхапіў яго і панёс далёка на суседнія вуліцы і кварталы. І нейкае прыемнае пачуццё ахапляе цябе, калі чуеш гэтую зладжаную песню працы ў разбітым і зруйнаваным горадзе. Горад жыве і ваюе. У ім куюцца працоўныя рэзервы—новае папаўненне рабочага класа.

Працоўны дзень падыходзіў да канца. Хутка праразлівы гудок сірэны паведаміў, што работа скончана. У працятых машынным маслам рабочых касцюмах выходзілі юнакі і дзяўчаты з майстэрань. Надышоў час адпачынку.

Павячэраўшы, вучні заходзілі ў інтэрнат. Адны рыхтавалі і правяралі лыжы, другія заходзілі ў чырвоны куток пачытаць газету, кнігу, паслухаць радыё. Аматары мастацкай самадзейнасці рыхтаваліся да чарговага выступлення. Групорг Палаеў у сваёй групе праводзіў агульны сход. Абмяркоўвалася пытанне аб дрэнных адносінах да работы некаторых вучняў. Выступаўшыя рэзка крытыкавалі паводзіны сваіх таварышоў, якія нядобрасумленна адносяцца да працы. Гэта дало станоўчыя вынікі.

Ініцыятарамі ўзорнай работы ў майстэрнях з'явіліся комсамольцы. Кожны комсамолец сочыць за работай на сваім участку, практычна дапамагае адстаючым таварышам. Камітэт пярвічнай арганізацыі ЛКСМБ праводзіць вялікую работу па ўцягненню ў рады комсамола моладзі. У першую чаргу ў комсамол прымаюцца стахановы і ўдарнікі, актывісты масавай работы. За параўнальна кароткі час комсамольская арганізацыя значна ўзрасла і зараз налічвае ў сваіх радах 30 процантаў состава вучняў. Лепшыя пісьменныя комсамольцы выбраны ў састаў рэдкалегіі насценнай газеты. Перыядычна і строга ў тэрмін выпускаецца газета. Апрача гэтага, у кожнай групе выпускаюцца баявыя лісткі.

Намеснік дырэктара па палітмасавай рабоце тав. Бадроў пільна сочыць за работай сваіх выхаванцаў, уваходзіць у кожную дэталь жыцця і работы вучылішча. Словам і справай дапамагае ён вучням.

Група лыжнікаў, вяртаючыся з прагулкі, падыходзіла да вучылішча. Гучэў голас запявалы тав. Шульгі:

«По долинам и по взгор'ям
шла дивизия вперед»...

у такт кроку падхапілі гэтую песню ўсе хорам і яна стала зычнай, бадзёрай, магутнай. Лясное рэха паўтарыла яе матыў.

Г. НЁМАНСКІ.

Забяспечым прамысловасць тарфяным коксам

Торф мае велізарнае народнагаспадарчае значэнне. Ён з'яўляецца каштоўнай сыравінай для рознастайных галін прамысловасці і сельскай гаспадаркі, а таксама для атрымання тарфянога коксу.

Тарфяны кокс прадстаўляе сабой паліва, атрыманае шляхам направання сухога торфу да высокай тэмпературы пры доступе паветра ў нязначнай колькасці. У сучасны момант у рэспубліцы адчуваецца вялікая патрэба ў каменнавугальным коксе для ліцейных і кузнечных майстэрань. Між тым, каменнавугальны кокс лёгка можа быць заменен тарфяным коксам, які да апошняга часу быў мала выкарыстан.

Тарфяны кокс валодае ўсімі якасцямі, якія патрабуюцца ад металургічнага паліва. Тарфяны кокс можна прымяняць як у металургіі—у доменных печах (драўнінавугальнага тыпу), так і ў чыгунналіцейнай справе (у сумесі з ліцейным антрацытам). У кавальскай справе тарфяны кокс замяняе кавальскі вугаль. Зварка на ім адбываецца хутка і добра. Пры рабоце тарфяны кокс не выдзяляе серністых газаў, шкодных пры рабоце ў кузнях.

Цяпер, калі попыт на каменны вугаль вельмі вялікі ўсюды,—на чыгунках, фабрыках і заводах,—на выраб тарфянога коксу трэба звярнуць сур'ёзную ўвагу, тым больш, што атрыманне яго магчыма вельмі простым і хуткім спосабам.

Запасы торфу ў нашай рэспубліцы вялікія і зручна размешчаны ў адносінах да прамысловых цэнтраў. Амаль кожны завод мае магчымасць атрымаць тарфяны кокс уласнымі сродкамі.

Тарфяны кокс па сваёй якасці раздзяляецца на ліцейна-металургічны і кузнечны. Характарыстыка гэтых відаў коксу наступная: вільготнасць коксу ліцейна-металургічнага—8 процантаў, кузнечнага — 12; вольнасць коксу ліцейна-металургічнага — 15 процантаў, кузнечнага—23; ліцейна-металургічны кокс утрымлівае серы 0,3 процанта, кузнечны — 0,4 процанта. Размер кавалкаў першага—ад 25 міліметраў, другога—ад 8 міліметраў. Цеплатворная здольнасць ліцейна-металургічнага коксу 7.500 калорый, кузнечнага—7.000 калорый.

Для атрымання добрага коксу неабходна скарыстаць добры торф. Не ўсякі торф прыгодны для атрымання коксу. Торф нізінных балот, асаковых, трасніковых і іншых менш прыгодны для коксу, таму што ён вельмі рассыпчаты і рыхлы. Для атрымання якаснага тарфянога коксу торф, што намячаецца для каксавання, павінен адпавядаць наступным умовам:

Кавалкавы торф машыннай выпрацоўкі з верхавой або пераходнай торфазалежы сярэдняй і добрай ступені разлажэння (30—50 процантаў) і з зольнасцю не звыш 6 процантаў (на абсалютна сухое вяшчэства).

Цагліны торфу павінны быць шчыльнымі, не мець прадольных шчылін і не крышыцца пры падзенні з вышыні 1,8 метра: форма і размер цаглины торфу—звычайна прынятыя ў тарфяной прамысловасці.

Торф павінен быць добрай перапрацоўкі, не мець буйных драўнінных уключэнняў.

Зольнасць гатовага торфу для кожнай паасобнай партыі (штабеля) не павінна перавышаць 4 процантаў.

Вільготнасць паветрана-сухога торфу не павінна перавышаць 37 процантаў. Торф павышанай вільготнасці дае вялікі процант дробязі і нізкія паказчыкі па якасці і выхаду.

Для каксавання не дапускаецца: дробязь, менш палавіны нармальнай цаглины торфу, адсырэўшыя нізы штабеляў і абледзянелыя тарфіны.

У мэтах забяспечання вырабу коксу добраякаснай сыравінай неабходна ў працэсе здабычы і сушкі торфу дабіцца асушкі кар'ераў і добра падрыхтаваных палёў сушкі, а таксама добрай перапрацоўкі торфу-сырца. Гэта дасягаецца дакладнай прыгонкай рэжучых і расціраючых элементаў прэса і торфарасціральніка. Абавязкова павінна праводзіцца ачыстка ачосу ўперадзе машын. Ніжні зазолены слой тарфяной залежы не павінен размывацца.

Штабеляваць торф трэба пры вільготнасці ў 40 процантаў. Тарфяны кокс з верхавых торфаў указанай вышэй якасці атрымліваецца шчыльны, звонкі і бліскучы ў зломе.

У сучасны момант каксаванне торфу вытвараецца як саматужным чынам (кастровы і ямна-кастровы), так і ў поўзавадскіх і заводскіх маштабах.

Ямна-кастровы спосаб атрымання коксу з торфу з'яўляецца адным з праспейшых саматужных спосабаў каксавання. Ён не патрабуе капітальных выдаткаванняў і, дзякуючы прастаце сваёй тэхналогіі, можа быць без асаблівых цяжкасцей укаранён на кожным торфпрадпрыемстве, якое мае каксуючыйся торф.

Гэты спосаб прымяняецца ў гаспадарках з праграмай вырабу коксу 100—150 тон за сезон. Аб'ём кастра складае каля 16 кубічных метраў. Увесь працэс каксавання цягнецца 7—9 сутак.

Кастровы спосаб мае некаторыя перавагі перад ямна-кастровым і прымяняецца ў гаспадарках з большым маштабам вытворчасці. Тэхналогія гэтага спосабу каксавання некалькі больш складаная, чым ямна-кастровага, і патрабуе для свайго абслугоўвання вопытных рабочых.

Пры гэтым спосабе кастры закладаюцца аб'ёмам ад 80 да 350 кубічных метраў. Для кастроў, аб'ёмам у 100—200 кубічных метраў, працягласць пры вільготнасці торфу ў 27—28 процантаў складае 24—30 сутак. Выхад коксу для такога кастра 27—30 процантаў ад колькасці каксуемага торфу.

У Беларускай ССР, апрача ўказаных спосабаў саматужнага вырабу тарфянога коксу, набывае шырокі разварот каксаванне торфу уральскім метадам у заводскіх маштабах з улаўліваннем лятучых вяшчэстваў і іх перапрацоўкай. Пры каксаванні торфу (або сухой перагонцы) атрымліваецца коксу 28—35 процантаў, дзёгцю 4—10 процантаў, падсмольнай вады 30—40 процантаў, газу 20—30 процантаў.

У 1945 годзе ў нашай рэспубліцы намечана будаўніцтва некалькіх коксавых батарэй уральскага тыпу на базе торфмасіва Міханавічы. Гэтаму пытанню зараз удзяляецца вялікая ўвага. Так, пры Галоўторфе Народнага камісарыята мясцовай паліўнай прамысловасці БССР створана група каксавання торфу. Інстытут торфу Акадэміі Навук займаецца распрацоўкай тыповых, удасканаленых коксавых заводаў, якія павінны ўступіць у строй у 1946 годзе. Выжыг на гэтых прадпрыемствах намячаецца ў 1.000 і 5.000 тон коксу ў год. Таксама вядзецца вялікая работа па адшуканню сыравінных баз для пабудовы коксавых заводаў.

Перспектывы развіцця торфакоксавай вытворчасці ва ўмовах нашай рэспублікі вельмі вялікія. У кожнай вобласці ёсць многа калгасных кузняў і заводаў, якія працуюць на прывазімым каменным або драўляным вугалі. Абласныя паліўныя аддзелы павінны паставіць сваю работу так, каб у бягучым годзе задаволіць усе патрэбы раённай прамысловасці ў коксе на месцы.

Шырокае распаўсюджанне аўтамабіляў і трактараў з газагенератарнымі ўстаноўкамі яшчэ больш павялічвае патрэбнасць у тарфяным коксе. Вопытамі даказана, што найбольш добрым палівам для аўтатрактарных газагенератараў з'яўляецца тарфяны кокс. Усё гэта гаворыць за тое, што выраб тарфянога коксу ў самы бліжэйшы час павінен набыць шырокае распаўсюджанне.

На працяту бліжэйшых год прамысловасць нашай рэспублікі павінна палкам перайсці на работу выключна на тарфяным коксе. Торф ва ўмовах Беларусі павінен стаць асноўнай сыравінай для развіцця нашай прамысловасці.

Інжынер-торфмейстар Б. ПАРЭМСКІ,
начальнік вытворча-тэхнічнага аддзела Наркамата мясцовай паліўнай прамысловасці.

Растуць кадры кваліфікаваных рабочых

На мінскім скураным заводзе «Большэвік» вопытныя майстры праводзяць вялікую работу па падрыхтоўцы новых кваліфікаваных кадраў. Кожны дзень непасрэдна ля станкоў майстры знаёмяць рабочых з усімі асаблівасцямі вывучаемых прафесій, дапамагаюць ім дабіваецца першых поспехаў. Раз у пяцідзённу праводзяцца кароткія тэарэтычныя заняткі, на якіх рабочыя знаёмяцца з тэхналагічным працэсам апрацоўкі скуры.

Майстар дубільнага аддзялення тав. Крукава за апошнія два з палавінай месяцы навучыла прафесіі дубільшчыка 5 рабочых. З іх тт. Максімаў і Гараховік ужо выконваюць нормы выпрацоўкі на 160—170 процантаў. Майстар аддзелачнай брыгады тав. Альтэровіч падрыхтавала 4 рабочых. З іх тав. Балотнікаў ужо самастойна працуе на складанні хімічных фарбавальнікаў, тав. Кураш добра авалодаў справай лашчыльшчыка. Абодва яны выконваюць дзённыя нормы на 140 процантаў.

Зараз на заводзе аднаўляюць другі хромавы цэх. Каб забяспечыць яго кваліфікаванымі кадрамі, пачата навучанне новай групы рабочых.

(БЕЛТА).

АБВЯРЖЭННЕ ТАСС

Гэтымі днямі рымскі бюлетэнь «Сервіцыо інфармацыоні» апублікаваў паведамленне аб тым, што пры пасрэдніцтве Злучаных Штатаў і пры падтрыманні з боку Вялікабрытаніі паміж Совецкім Саюзам і Ватыканам нібыта адбываюцца перагаворы з мэтай заключэння пагаднення.

ТАСС упаўнаважаны заявіць, што гэтае паведамленне названага бюлетэня зусім не адпавядае сапраўднасці.

МІТЫНГ УДЗЕЛЬНІКАЎ АДНАЎЛЕННЯ ВАРШАВЫ

ВЫСТУПЛЕННЕ Э. ОСУБКА-МАРАЎСКАГА і Н. С. ХРУШЧОВА

ВАРШАВА, 8 сакавіка. (ТАСС). Гэтымі днямі па закліку Рады Нарадовай дзесяткі тысяч жыхароў польскай сталіцы з рыдлёўкамі і кіркамі выйшлі на вуліцы для ўдзелу ў работах па аднаўленню горада. На плошчы «Трох крыжоў» адбыўся мітынг жыхароў горада Варшавы—удзельнікаў работ па аднаўленню сталіцы. Бурнымі авацыямі было сустрэта паяўленне на трыбуне прэзідэнта Краёвай Рады Нарадовай Берута, прэм'ер-міністра Осубка-Мараўскага, членаў урада і генералаў Польскага Войска. Бурныя авацыі і гарачыя прывітальныя воклічы выклікала паяўленне на трыбуне членаў камісіі экспертаў, камандзіраваных урадам Совецкага Саюза для аказання дапамогі па аднаўленню горада Варшавы, на чале са Старшынёй Соўнаркома УССР Н. С. Хрушчовым.

Адкрываючы мітынг, генерал Спыхальскі сказаў: «Нямецкія каты разбурылі наш родны горад. Польскі народ, у першую чаргу насельніцтва нашай страдаўняй сталіцы, зробіць усё, каб як мага хутчэй аднавіць Варшаву. Да работы прыступае ўсё насельніцтва нашай сталіцы. Совецкі народ і яго вялікі правадыр і лепшы друг польскага народа Маршал Сталін працягнулі нам руку дапамогі. Сёння мы рады вітаць дарагіх гасцей—членаў камісіі экспертаў Совецкага Саюза на чале з вялікім другам польскага народа Старшынёй Соўнаркома Украіны Хрушчовым».

Затым Спыхальскі прадаставіў слова прэм'ер-міністру Осубка-Мараўскаму.

— «Варшава, якая будавалася вякамі,—сказаў ён,—ляжыць зараз у руінах. Нашы спрадвечныя ворагі—немцы хацелі знішчыць увесь польскі народ, знішчаючы яго ў Майданеку, Освенціме і іншых «лагерах смерці». Немцы палілі дом за домам, знішчалі гістарычныя і культурныя каштоўнасці нашай сталіцы, але яны не маглі зламаць духу нашага народа, знішчыць яго волю да свабоды і незалежнасці. Яны не маглі канчаткова знішчыць і Варшаву. Гэтаму перашкодзіла доблесная Чырвоная Армія, якая хутка выгнала немцаў з польскай зямлі і ў сучасны момант стаіць ужо ля сцен Берліна. Варшаву будавалі пакаленні. Мы павінны аднавіць Варшаву ў кароткія тэрміны. Гераічны народ Варшавы прыкладзе ўсе сілы, праявіць свой палкі патрыятызм у справе аднаўлення роднай сталіцы. Пачуццё глыбокай падзякі ахапіла кожнага з нас, калі мы даведаліся, што ўрад Совецкага Саюза рашыў аказаць нам брацкую дапамогу ў справе аднаўлення Варшавы. Гісторыя не ведае прыкладаў такой дапамогі, якую аказвае ўрад Совецкага Саюза, прыняўшы на сябе 50 процантаў усіх работ па аднаўленню Варшавы».

Осубка-Мараўскі закончыў сваю прамову віншаваннем у чэсць гераічнага народа Варшавы, у чэсць дружбы польскага і совецкага народаў, у чэсць Чырвонай Арміі і Маршала Сталіна. Па плошчы праносіцца магутнае «нех жые!».

Затым слова прадастаўляецца сустрэтаму авацыяй кіраўніку камісіі экспертаў Совецкага Саюза, Старшыні Соўнаркома УССР Н. С. Хрушчову. Ён сказаў:

«Сябры, грамадзяне горада Варшавы! Па даручэнню Маршала Сталіна я разам з групай работнікаў цэнтральных арганізацый і спецыялістаў горада Масквы і Кіева прыехаў сюды, у вашу слаўную сталіцу, каб на месцы азнаёміцца са становішчам горада і тым самым мець магчымасць лепш і канкрэтней вырашыць пытанне, якую дапамогу неабходна аказаць у аднаўленні Варшавы. Мы ўбачылі жудасны малюнак разбурэнняў. Нямецкія варвары зраўнялі з зямлёй цэлыя кварталы цудоўнага горада Варшавы—аднаго з прыгажэйшых гарадоў Еўропы. Зладзеянні нямецкіх захопнікаў у Варшаве і іншых гарадах выклікаюць у кожнага з нас пачуццё яшчэ большай нянавісці да нямецкіх фашыстаў. Гэтыя разбурэнні павінны яшчэ больш узняць у нас ярасць супроць нашага агульнага ворага, яшчэ больш згуртаваць славянскія народы супроць нямецка-фашысцкіх захопнікаў.

У гісторыі нашых народаў былі перыяды, калі польскі і украінскі народы, калі польскі і рускі народы знаходзіліся ў варожых адносінах паміж сабой. Гэтая варожасць штучна распальвалася ворагамі нашых народаў, і плады гэтай варожасці пажыналіся ворагамі славянства. Але гэты час беззваротна прайшоў у цяжкіх выпрабаваннях, якія прынесла польскаму, украінскаму, рускаму і другім славянскім народам гэтая нябачаная спусташальная вайна. Нашы народы разам пераносілі пакуты, разам плячо ў плячо змагаліся супроць нашага агульнага ворага—нямецкіх фашыстаў. У ходзе гэтай вялікай барацьбы з кожным днём усё больш і больш умацоўвалася дружба паміж совецкім і польскім народамі. Гэтую дружбу, змацаваную крывёю нашых народаў, ніколі і нікому не ўдасца пахіснуць. Чырвоная Армія, якая разам з Польскім Войскам вызваліла Польшчу ад нямецкіх акупантаў, прынесла свабоду і незалежнасць польскаму народу.

— Я асабліва шчасліў,—гаворыць Н. С. Хрушчоў,—што Маршал Сталін даручыў мне разам з архітэктарамі, інжынерамі і другімі спецыялістамі па будаўніцтву выехаць у Варшаву, каб аказаць максімальную дапамогу ў аднаўленні вялікай слаўнай сталіцы. Таварыш Сталін гаварыў нам: «Трэба зрабіць усё, усё, што мы можам, і ўсё, што патрэбна, для аднаўлення Варшавы». Горад Варшава быў цудоўным. Няма сумнення ў тым, што польскі народ адновіць сваю сталіцу, зробіць яе яшчэ больш цудоўнай. Совецкі Саюз акажа ў гэтым вялікую дапамогу. Абяцанні, дадзеныя таварышом Сталіным, дадзеныя совецкім урадам будуць поўнасцю выкананы.

Наш совецкі народ мае ўжо вялікі вопыт аднаўлення разбураных немцамі гарадоў і прамысловых прадпрыемстваў. Совецкія архітэктары і будаўнікі з вялікай радасцю падзеляцца сваім вопытам аднаўленчых работ. У нас, на Украіне, праводзяцца вялікія работы па аднаўленню гарадоў і прамысловых цэнтраў. Хуткімі тэмпамі аднаўляецца сталіца Совецкай Украіны—горад Кіеў. У гэтай вялікай рабоце прымае ўдзел усё насельніцтва сталіцы. Аднаўляючы разбураную немцамі лепшую частку горада—вуліцу Крэшчацік, мы ведаем, мы перакананы, што Кіеў і Крэшчацік пасля аднаўлення будуць яшчэ лепшымі, чым раней. Нам дапамагаюць лепшыя архітэктары Масквы, Ленінграда і іншых гарадоў саюзных рэспублік. Дазвольце перадаць вам пажаданне поспехаў у справе аднаўлення разбуранай немцамі народнай гаспадаркі Польскай рэспублікі, у справе аднаўлення польскай сталіцы Варшавы. Жыхары горада Варшавы добра адбудуюць сваю сталіцу, зробяць яе яшчэ лепшай і прыгажэйшай, чым яна была раней. Заканчваючы сваё выступленне, я заклікаю польскі народ умацоўваць вечную дружбу паміж славянскімі народамі. Дружба славянскіх народаў назаўсёды гарантуе нас ад пасяганняў ворагаў і дасць магчымасць мірна будаваць наша жыццё, як таго хочуць нашы народы.

Няхай жыве польска-совецкая дружба! Няхай жыве Польская незалежная дэмакратычная рэспубліка!».

Над плошчай доўга не змаўкаюць бурныя авацыі і прывітальныя воклічы ў чэсць прэзідэнта Краёвай Рады Нарадовай Берута, прэм'ер-міністра Осубка-Мараўскага, у чэсць доблеснай Чырвонай Арміі і яе вялікага правадыра Маршала Сталіна.

ПРЫГАВОР ПА СПРАВЕ ФАШЫСЦКІХ ГРУП РОАТА І СУВІЧА

ПАРЫЖ, 13 сакавіка. (ТАСС). Агенцтва Франс Прэс перадае паведамленне з Рыма аб тым, што генерал Роата прыгаворан заочна да пажыццёвага турэмнага зняволення. Былы фашысцкі пасол у Берліне Анфузо прыгаворан да смерці. Сувіч і былы намеснік у Албаніі Якомоні прыгавораны да 24 гадоў турэмнага зняволення кожны. Генерал Парыані, які знаходзіцца ў Паўночнай Італіі, прыгаворан заочна да 15 гадоў і Паоло Анджыолі (таксама заочна) да 20 гадоў турэмнага зняволення.

НОВЫ ЗАКОНАПРАЕКТ АБ СПЕЦЫЯЛЬНЫХ ПАЎНАМОЦТВАХ БЕЛЬГІЙСКАМУ УРАДУ

ЛОНДАН, 13 сакавіка. (ТАСС). Брусельскі карэспандэнт агенцтва Рэйтэр паведамляе, што пасля таго, як бельгійскі прэм'ер Ван Акер узяў назад свой законапраект аб прадастаўленні спецыяльных паўнамоцтваў ураду з прычыны адмоўных адносін да гэтага законапраекта большасці сената, ён склаў новы законапраект аб паўнамоцтвах, у адносінах якога ён будзе прасіць вотума давер'я.

Новы законапраект, які павінен мець сілу на працягу 6 месяцаў, прадугледжвае прадастаўленне ўраду яшчэ больш шырокіх паўнамоцтваў для ажыццяўлення нацыянальнай праграмы з шасці пунктаў, а іменна: інтэнсіфікацыя здабычы вугалю, карныя меры супроць спекулянтаў чорнага рынка, пакаранне здраднікаў і агентаў «пятай калоны», устанаўленне ўзроўню цэн, умацаванне бельгійскай валюты, рашучае вядзенне вайны на баку саюзнікаў.

ПРЭЗІДЭНТ ЧЭХАСЛАВАКІІ ВЫЕХАЎ З ЛОНДАНА

ЛОНДАН, 12 сакавіка. (ТАСС). Як перадае англійскае міністэрства інфармацыі, прэзідэнт Чэхаславакіі Бенеш 11 сакавіка выехаў з Англіі на радзіму, куды ён павінен прыбыць да пачатку красавіка. Бенеш правядзе два тыдні ў Маскве. Бенеша суправаджае міністр замежных спраў Масарык.

ДЭКЛАРАЦЫЯ НОВАГА ЮГАСЛАЎСКАГА УРАДА

БЕЛГРАД, 10 сакавіка (ТАСС). Вечарам 9 сакавіка югаслаўскі прэм'ер-міністр маршал Іосіп Броз Тіто выступіў па радыё з дэкларацыяй новага югаслаўскага ўрада.

«Наша радзіма,—гаворыць маршал Тіто,—атрымала адзіны ўрад, што з'яўляецца неабходнай умовай хутчэйшага і найбольш паспяховага сканчэння вайны і хуткага і планамернага аднаўлення нашай краіны».

«Урад, перш за ўсё, лічыць сваім абавязкам падкрэсліць у якасці сваёй першай і самай галоўнай мэты, дасягненню якой ён аддасць усе свае сілы,—хутчэйшае выгнанне або знішчэнне фашысцкіх акупантаў на яшчэ не вызваленых тэрыторыях нашай радзімы, а таксама разгром і знішчэнне квіслінгаўскіх і здраднічскіх сіл, якія змагаюцца супроць уласнай радзімы пад сцягамі акупантаў і варожай рэакцыі».

«Урад,—гаворыцца далей у дэкларацыі,—зробіць усё, каб нашы нацыянальныя тэрыторыі, якія пасля першай сусветнай вайны асталіся па-за межамі нашай дзяржавы, былі далучаны да яе, тым больш, што агульным народна-вызваленчым паўстаннем супроць іншаземных захопнікаў у ходзе гэтай вайны насельніцтва гэтых тэрыторый фактычна ўжо далучылася і выступіла за дэмакратычную федэратыўную Югаславію. Нашы народы набылі на гэта права не толькі на падставе прынцыпа самавызначэння нацый, не толькі сваёй пераважнай большасцю на гэтых тэрыторыях, але і, у прыватнасці, тым, што іменна там сваёй узброенай барацьбой яны аказалі вялікія ўслугі агульнай справе Аб'еднаных Нацый.

Вялікія нацыянальна-дэмакратычныя дасягненні нашых народаў, якія заваяваны цаной нязмерных афяр і якія знайшлі сваё выражэнне ў рашэннях другой сесіі Аўною, што адбылася 10 лістапада 1944 года ў горадзе Яйцэ, з'яўляюцца асновай творчай дзейнасці ўрада.

Ахоўваючы, як святыню, роўнапраўе ўсіх народаў Югаславіі, урад прадоўжыць справу ўмацавання брацтва паміж імі, усведамляючы, што гэта з'яўляецца краевугольным камнем больш шчаслівай будучыні, добрабыту і міру для ўсіх іх. Сёння кожнаму ясна, што такое ўрэгуляванне адносін паміж нашымі народамі дало нашаму дзяржаўнаму аб'еднанню—дэмакратычнай федэратыўнай Югаславіі—аўтарытэт і сілу, якіх яно ў мінулым ніколі не мела. Аднак у той-жа самы час цяжкая барацьба за свабоду зноў пацвердзіла і паказала, што адзіная Югаславія з'яўляецца жыццёвай патрэбнасцю для ўсіх яе народаў, што яна з'яўляецца не якімсці выпадковым стварэннем, а гістарычнай неабходнасцю, без якой свабода паасобных яе народаў немагчыма.

Дэмакратычныя правы, якія заваяваны нашымі народнымі масамі ў ходзе народна-вызваленчай вайны і якія знаходзяць у першую чаргу сваё выражэнне ў структуры народнай улады, павінны быць захаваны ў магчыма большай ступені, паколькі дазваляюць цяперашнія ваенныя ўмовы. Гэта асабліва датычыць правоў кожнага грамадзяніна і яго свабод, як-та: асабістая свабода, свабода веравызнання, свабода слова, свабода друку і аб'еднанняў».

Дэкларацыя ўказвае, што ўздым эканамічнага жыцця краіны з'яўляецца цэнтральным пытаннем тыла.

Далей дэкларацыя змяшчае праграму практычнай дзейнасці ўрада.

«Нашы народы, — гаворыцца ў дэкларацыі, — плячо ў плячо з саюзнікамі будуць весці вайну да поўнай перамогі, гэта значыць да безагаворачнай капітуляцыі гітлераўскай Германіі.

Дружаственныя адносіны з саюзнікамі ўрад будзе падтрымліваць і ў будаўніцтве пасляваеннага свету».

Сваю першую праграмную заяву ўрад заканчвае заклікам да ўсяго народа Югаславіі, да ўсіх прагрэсіўных і здрававыслячых людзей, цалкам аддацца барацьбе за перамогу над ворагам і справе аднаўлення краіны.

ВАЕННЫЯ ДЗЕЯННІ Ў ЗАХОДНЯЙ ЕЎРОПЕ

ЛОНДАН, 12 сакавіка. (ТАСС). У паведамленні штаба вярхоўнага камандавання экспедыцыйных сіл саюзнікаў гаворыцца, што войскі саюзнікаў ліквідавалі прадмостнае ўмацаванне праціўніка на заходнім беразе Рэйна ля Везеля. Саюзнікі расшырылі сваё прадмостнае ўмацаванне ля Рэмагена да 9 міль у шырыню і 3 міль у глыбіню. У гэтым раёне саюзнікі занялі 5 гарадоў, у тым ліку Лінц.

Некалькі на поўдні ад праціўніка ачышчан участак на беразе Рэйна працяжэннем у 6 міль. Саюзнікі знаходзяцца ў адной мілі на поўначы ад Кобленца. У часе аперацый па ачыстцы паўночнага берага ракі Мозель паміж Кобленцам і Кохенам захоплена многа гарадоў і вёсак.

У паведамленні ўказваецца, што саюзнікі за 11 сакавіка занялі больш 30 гарадоў і вёсак. 10 сакавіка захоплена 4.719 палонных.

* * *

ЛОНДАН, 13 сакавіка. (ТАСС). У паведамленні штаба вярхоўнага камандавання экспедыцыйных сіл саюзнікаў гаворыцца, што прадмостнае ўмацаванне саюзнікаў на Рэйне цяпер прасцірае цца на 6,2 кілометра ў глыбіню і на 16 кілометраў па фронту. Баі ідуць на абодвух аканечнасцях гэтага ўмацавання ў Гонефе і Генінгене. Супраціўленне праціўніка пачынае ўзмацняцца, але інтэнсіўнасць яго артылерыйскага агня аслабявае.

Нямецкія часці, якія знаходзяцца ў мяшку ля возера Лаахерзее, знішчаюцца. Саюзнікі цяпер кантралююць увесь паўночны бераг ракі Мозель, за выключэннем адрэзку ў 16 кілометраў паміж Кохенам і Рэйлем. На паўночным усходзе ад Трыра саюзнікі занялі Рыо і прасунуліся на 1,5 кілометра.

У раёне Саарбрукена і Гардцкіх гарах адбіты нязначныя варожыя атакі.

11 сакавіка саюзнікі захапілі 4.980 палонных.

ЛОНДАН, 13 сакавіка. (ТАСС). У паведамленні штаба ўзброеных сіл саюзнікаў на міжземнаморскім тэатры ваенных дзеянняў гаворыцца, што ў Італіі часці 5 арміі занялі ўзвышша, якое знаходзіцца на захадзе ад шасе Пістоя—Балонья.

БАМБАРДЫРОЎКА БЕРЛІНА, ЭСЕНА, БРЭМЕНА, ГАМБУРГА І КІЛЯ

ЛОНДАН, 12 сакавіка. (ТАСС). Як перадае англійскае міністэрства інфармацыі, у ноч на 12 сакавіка англійскія самалёты «Маскіта» зрабілі новы налёт на Берлін. Было скінута многа бомб вагай каля 2 тон кожная.

Паводле паведамлення агенцтва Рэйтэр, учора ў другой палавіне дня звыш тысячы англійскіх бамбардыроўшчыкаў зрабілі налёт на Эсен. Самалёты скінулі вялікую колькасць фугасных бомб.

Каля 1.200 цяжкіх бамбардыроўшчыкаў з састава амерыканскага 8-га авіяцыйнага корпуса ў суправаджэнні звыш 750 знішчальнікаў зрабілі налёт на верфі падводных лодак у Брэмене, Гамбургу і Кілі.

Водгукі ў Румыніі на абмен пісьмамі паміж кіраўнікамі румынскага і совецкага ўрадаў

БУХАРЭСТ, 11 сакавіка. (ТАСС). Сёння ўсе газеты прысвячаюць перадавыя артыкулы ўстанаўленню румынскай адміністрацыі ў Паўночнай Трансільваніі. Большасць газет публікуе ў гэтай сувязі партрэты таварыша Сталіна, Петрэ Гроза і караля Румыніі. Перадавы артыкул газеты «Скынтэйя» адзначае, што «гэты вялікадушны крок мог-бы мець месца даўно, калі-б на чале краіны знаходзіўся дэмакратычны ўрад, а не ўрад, які быў у сваёй большасці прафашысцкім».

Аўтар артыкула піша, што «румынскі народ ніколі не забудзе дапамогі, атрыманай ад совецкага народа. Румынскі народ заўсёды будзе ўдзячны Чырвонай Арміі-вызваліцельніцы і яе Вярхоўнаму Галоўнакамандуючаму геніяльнаму Сталіну за вызваленне нашай радзімы і за аднаўленне Паўночнай Трансільваніі ў граніцах Румыніі».

Газета «Журналул дэ Дыміняца» піша, што рашэнне совецкага ўрада адносна ўстанаўлення румынскай адміністрацыі ў Паўночнай Трансільваніі грунтуецца як на правах Румыніі на гэтую тэрыторыю і давер'і да ўрада Гроза з боку Совецкага Саюза, так і на абавязках, якія кладуцца на Румынію ў справе захавання парадку і спакою ў тылу румына-совецкіх войск.

Газета «Скынтэйя» паведамляе, што на ўсіх прадпрыемствах і ва ўстановах сталіцы адбыліся сходы, на якіх рабочыя і служачыя заводаў, фабрык і ўстаноў з энтузіязмам віталі вялікадушнае рашэнне совецкага ўрада і першы буйны поспех новага дэмакратычнага ўрада Румыніі.

Газеты нацыянальна - дэмакратычнага фронта, а таксама «Тымпул» і «Журналул» публікуюць тэкст тэлеграмы ад інтэлігентаў—членаў таварыства Арлюс на імя таварыша Сталіна, у якой выказваецца ўдзячнасць за ўстанаўленне румынскай адміністрацыі ў Паўночнай Трансільваніі.

Паводле паведамлення «Універсул», учора прэм'ер-міністра Гроза наведала дэлегацыя трансільванцаў, якая выказала яму падзяку за дасягнутае кіруемым ім урадам уз'яднанне Паўночнай Трансільваніі з Румыніяй.

АМЕРЫКАНСКІ ДРУК АБ АБМЕНЕ І Г. ТАТАРЭСКУ

НЬЮ-ЙОРК, 11 сакавіка. (ТАСС). Амерыканскі друк апублікаваў на відным месцы паведамленне аб пісьме старшыні совета міністраў Румыніі П. Гроза і віцэ-старшыні совета міністраў і міністра замежных спраў Г. Татарэску Старшыні Соўнаркома СССР І. В. Сталіну і аб адказе І. В. Сталіна.

ПІСЬМАМІ ПАМІЖ П. ГРОЗА І І. В. СТАЛІНЫМ

Каментыруючы гэтае паведамленне, газета «Нью-Йорк таймс» піша, што ўрад Гроза дабіўся буйнейшага палітычнага поспеху, якога дабіваўся калі-небудзь румынскі ўрад з часу Трыанонскага дагавора, і гэта павялічыць папулярнасць Гроза сярод румын, а таксама ўмацуе дружбу паміж СССР і Румыніяй.

ПАСЕДЖАННЕ РУМЫНСКАГА УРАДА

БУХАРЭСТ. 11 сакавіка (ТАСС). Бухарэсцкае радыё паведамляе, што ўчора адбылося паседжанне совета міністраў пад старшынствам прэм'ер міністра Петру Гроза. Совет міністраў з велізарнай радасцю сустрэў рашэнне Совецкага Урада адносна ўстанаўлення румынскай адміністрацыі ў Паўночнай Трансільваніі і выказаў па гэтаму поваду ўдзячнасць Маршалу Сталіну. Совет міністраў пастанавіў у сувязі з гістарычным актам, які заклаў аснову цеснай дружбы паміж Румыніяй і яе вялікім саюзнікам, лічыць 11, 12 і 13 сакавіка святочнымі днямі. У гэтыя дні ўся краіна будзе святкаваць зварот Паўночнай Трансільваніі мацеры-радзіме.

Совет міністраў прыняў рашэнне аб пакаранні асоб, вінаўных у сабатажы, і аб устанаўленні ў сувязі з гэтым адпаведнага закона.

ДА УСТАНАЎЛЕННЯ АДМІНІСТРАЦЫІ РУМЫНСКАГА УРАДА У ТРАНСІЛЬВАНІІ

БУХАРЭСТ, 12 сакавіка. (ТАСС). Совет Нацыянальна-дэмакратычнага фронта атрымаў ад совета Нацыянальна-дэмакратычнага фронта Паўночнай Трансільваніі наступную тэлеграму, апублікаваную ўчора ўсімі газетамі:

«У сувязі з тэлеграмай вялікага правадыра СССР Маршала Сталіна і дэкларацыяй Гроза Совет Нацыянальна-дэмакратычнага фронта Паўночнай Трансільваніі з невыказнай словамі радасцю вітае зварот Паўночнай Трансільваніі ў румынскую дзяржаву. Мы ўпэўнены ў тым, што ўрад давядзе да канца справу дэмакратызацыі краіны і павагі дэмакратычных свабод. Няхай жыве Маршал Сталін! Няхай жыве ўрад Гроза! Няхай жыве дэмакратычная Трансільванія, уз'еднаная з Румыніяй, свабоднай, дэмакратычнай і незалежнай.

АБМЕН ТЭЛЕГРАМАМІ ПАМІЖ ЧЭРЧЫЛЕМ І ЭЙЗЕНХАУЭРАМ

ЛОНДАН, 11 сакавіка. (ТАСС). Як перадае агенцтва Рэйтэр, прэм'ер-міністр Чэрчыль адправіў 9 сакавіка вярхоўнаму галоўнакамандуючаму экспедыцыйных сіл саюзнікаў генералу Эйзенхаўэру тэлеграму, у якой віншуе яго з атрыманай саюзнымі арміямі вялікай перамогай, у выніку якой будзе дасягнут разгром або знішчэнне ўсіх немцаў на захадзе ад Рэйна. Адзначыўшы заслугі амерыканскіх войск, Чэрчыль выказаў задавальненне з поваду таго, што англійскія і канадскія арміі на поўначы адыгралі ролю ў ажыццяўленні далёка ідучых пабеданосных замыслаў Эйзенхаўэра.

Эйзенхаўэр адказаў Чэрчылю тэлеграмай, у якой выказаў падзяку за цёплае віншаванне з поваду апошніх перамог войск саюзнікаў.

ПРАСЛЕДВАННЕ ПОЛЬСКІМІ ЭМІГРАНЦКІМІ УЛАДАМІ АФІЦЭРАЎ, ЖАДАЮЧЫХ ВЯРНУЦЦА НА РАДЗІМУ

ЛОНДАН, 11 сакавіка. (ТАСС). Як перадае агенцтва Рэйтэр, у Лондане стала вядома, што назначаны польскім эміграцкім урадам новы галоўнакамандуючы польскімі войскамі генерал Андро зняў з пасады значную колькасць польскіх афіцэраў, якія выказалі жаданне вярнуцца ў Польшчу і служыць у рэарганізаванай арміі Часовага Польскага Урада.

МАНЕРГЕЙМ ЗНОЎ ПРЫСТУПІЎ ДА ВЫКАНАННЯ СВАІХ АБАВЯЗКАЎ

ХЕЛЬСІНКІ, 10 сакавіка. (ТАСС). Фінскае тэлеграфнае бюро паведаміла, што 10 сакавіка прэзідэнт Фінляндыі зноў прыняў на сябе свае паўнамоцтвы і абавязкі.

ВАЙНА НА ЦІХІМ АКІЯНЕ

ЛОНДАН, 12 сакавіка. (ТАСС). Як афіцыяльна паведамляецца, амерыканскія войскі высадзіліся на паўднёва-заходняй аканечнасці вострава Мінданас (Філіпіны), сустрэўшы нязначнае супраціўленне з боку японцаў.

ВАШЫНГТОН, 12 сакавіка. (ТАСС). Каля 300 звышмагутных «Лятаючых крэпасцей» з грузам фугасных і запальваючых бомб агульнай вагай у 2 тысячы тон зрабілі налёт на горад Нагоя (цэнтральная Японія). У цэнтры горада ўзніклі пажары на плошчы 5 квадратных міль. Звышмагутныя «Лятаючыя крэпасці» зрабілі таксама налёт на японскія прадпрыемствы ў Сінгапуры.

Адказны рэдактар
В. САМУЦІН.

Тэатр і кіно:

Беларускі Дзяржаўны ордэна Леніна тэатр оперы і балета

У памяшканні Дома Чырвонай Арміі 17 сакавіка.

ПРЭМ'ЕРА

Д. Пучыні

«МАДАМ БАТЭРФЛЕЙ»

(Чыо-Чыо-Сан)

Опера ў 3-х дзеях.

Пачатак у 19 гадзін 30 мінут.

Кінотэатр «Першы» «СЭРЦЫ ЧАТЫРОХ»

Кінотэатр «Беларусь» «ВОЛГА-ВОЛГА»

Дзіцячы кінотэатр «Радзіма»

Для дзяцей

«ЗАЛАТЫ КЛЮЧЫК»

Пачатак сеансаў у 10, 12, 14, 16 і 18 гадзін.

Для дарослых

«ПЯТЫ АКІЯН»

Пачатак сеансаў у 20 і 22 гадзіны.

АДКРЫТ ПРЫЁМ ПАДПІСКІ

на цэнтральныя і рэспубліканскія

ГАЗЕТЫ і ЧАСОПІСЫ на II квартал 1945 года.

ПАДПІСКА ПРЫМАЕЦЦА З 9 ДА 18 ГАДЗІН (без выходных дзён) У НАСТУПНЫХ ПУНКТАХ:

1. Аблсаюздрук (Совецкая 40, будынак Упраўлення сувязі)
2. У гарадскім аддзеле Саюздруку (Кірава 41, памяшканне пошты)

Спяшайцеся аформіць падпіску!

АБЛСАЮЗДРУК

Упраўленне дзяржаўнага страхавання БССР

ПРАВОДЗІЦЬ

ПРАЗ СВАЕ РАЕННЫЯ І ГАРАДСКІЯ ІНСПЕКЦЫІ

ДОБРААХВОТНАЕ СТРАХАВАННЕ МАЁМАСЦІ:

УСТАНОЎ, ЯКІЯ ЗНАХОДЗЯЦЦА НА МЯСЦОВЫМ БЮДЖЭЦЕ, і падпарадкаваных ім прамысловых, комунальных, гандлёвых і сельскагаспадарчых прадпрыемстваў і арганізацый;

ДОМАЎПРАЎЛЕННЯЎ І ЖЫЛЛЁВЫХ УПРАЎЛЕННЯЎ мясцовых Саветаў дэпутатаў працоўных;

КААПЕРАЦЫЙНЫХ, ПРАФЕСІЯНАЛЬНЫХ І ГРАМАДСКІХ АРГАНІЗАЦЫЙ.

НА СТРАХАВАННЕ ПРЫМАЮЦЦА: усякага роду будынкі (апрача дзяржаўнага і жылога фонда), абсталяванне, інвентар, тавары, матэрыялы і хатняя жывёла.

Упраўленне дзяржстраха БССР.

ВЫЙГРЫШНЫЯ УКЛАДЫ

У дзяржаўных працоўных ашчадных касах уведзены апэрацыі па прыёму ад насельніцтва выйгрышных укладаў

ПРЫЁМ ВЫЙГРЫШНЫХ УКЛАДАЎ ПРАВОДЗІЦЦА УСІМІ АШЧАДНЫМІ КАСАМІ.

УКЛАДЧЫКІ, ЯКІЯ МАЮЦЬ НА ЗАХОЎВАННІ У АШЧАДНЫХ КАСАХ ВЫЙГРЫШНЫЯ УКЛАДЫ, КАРЫСТАЮЦЦА УСІМІ ПРАВАМІ, ПРАДАСТАЎЛЕНЫМІ УКЛАДЧЫКАМ АШЧАДНЫХ КАС, як-та:

СВАБОДНА РАСПАРАДЖАЦЦА СВАІМ УКЛАДАМ, ЗАХОЎВАННЕ УКЛАДАЎ У АШЧАДНЫХ КАСАХ НЕ АБМЯЖОЎВАЕЦЦА НІЯКІМІ ТЭРМІНАМІ.

ЦЭЛАСЦЬ УКЛАДАЎ, УНЕСЕНЫХ У АШЧАДНЫЯ КАСЫ, ГАРАНТЫРУЕЦЦА ЎРАДАМ САЮЗА ССР.

АШЧАДНЫЯ КАСЫ ЗАХОЎВАЮЦЬ ТАЙНУ УКЛАДАЎ.

Даходы па выйгрышных укладах выплачваюцца ў форме выйгрышаў.

ТЫРАЖ ВЫЙГРЫШАЎ ПРАВОДЗІЦЦА ДВА РАЗЫ У ГОД ПА ПАЎГОДДЗЯХ: у першай дэкадзе красавіка і ў першай дэкадзе кастрычніка, цэнтралізавана ў кожнай абласці.

У кожным тыражы на 1.000 нумароў рахункаў (укладаў) па выйгрышных укладах падае 25 выйгрышаў, у тым ліку адзін выйгрыш у размеры дзвесце процантаў сярэдняга астатка ўклада за прайшоўшае паўгоддзе; два выйгрышы ў размеры ста процантаў сярэдняга астатка ўклада і дваццаць два выйгрышы кожны ў размеры пяцьдзесят процантаў сярэдняга астатка ўклада за прайшоўшае паўгоддзе.

Уносьце вашы зберажэнні ў ашчадныя касы на выйгрышныя ўклады!

УПРАЎЛЕННЕ ДЗЯРЖАШЧАДКАС І ДЗЯРЖКРЭДЫТА БЕЛАРУСКАЙ ССР.

Дзяржаўнаму Выдавецтву БССР ПАТРАБУЮЦЦА

на сталую працу: галоўны бухгалтар, намеснік галоўнага бухгалтара, планавік-эканаміст, калькулятар, бібліятэкар, загадчык гаспадаркі, начальнік адміністрацыйна-гаспадарчага аддзела, карэктары, тэхрэдактары і шофер.

ЗВЯРТАЦЦА ПА АДРАСУ: Мінск, вул. Пушкіна, 55, Дом друку, 4-ты паверх, аддзел кадраў.

Атэлье мод швейнай фабрыкі імені Крупскай ПАТРАБУЮЦЦА:

галоўныя бухгалтары, галоўныя інжынеры нарміроўшчыкі, канструктары-швейнікі, кваліфікаваныя краўцы і краўцы масавага пашыву.

ЗВЯРТАЦЦА ПА АДРАСУ: г. Мінск, вул. Варашылава, 2.

АТ28155 АДРАС РЭДАКЦЫІ І ВЫДАВЕЦТВА: г. Мінск, вул. Пушкіна, 55, 3-ці паверх. Тэлефоны: Адказнага рэдактара—149, Адказнага сакратара—150.